Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 187 (5861) | 15 жніўня 1937 г., нядзеля | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЕННЯ У НУМАРЫ:

Ад Урадавай Камісіі па арганізацыі пералёту Масква — Паўночная Амерыка.

Пленум Менскага гаркома КП(б)Б. Тав. ВОЛКАЎ А. А. выбран выконваючым абавязкі першага сакратара МГК КП(б)Б.

Кожны калгасны двор павінен атрымаць устаноўлены па норме прысядзібны ўчастак.

АРТЫКУЛЫ:

ПЕРАДАВЫ. — Лясы і іх угоддзі — на службу совецкаму народу.

М. Астапенка. — Выкарчоўваць польскіх шпіёнаў.

Н. Вішнеўскі. — Сіла прыкладу.

В. З. — Дзіўныя паводзіны парткома Наркомасветы.

О. Чэчык. — Шкодніцтва ў Хоцімскай МТС.

ЗА РУБЯЖОМ:

Ваенныя падзеі ў Паўночным Кітаі. — Жорсткія баі на вуліцах Шанхая. — Трохдзённы бой у раёне Цзіньхочэня. — Заява Ван Цзін-вея. — Пажары ў Чапеі. — Беспаспяховая атака японцаў на Тулючэнь. — Паветраны бой паміж японскімі і кітайскімі самалётамі. — На франтах у Іспаніі.— Аб стварэнні адзінай партыі іспанскага пролетарыята. — Мяцежнікі затапілі дацкі параход. — Дзеянні рэспубліканскай авіяцыі. — Хваляванні ў войсках мяцежнікаў. — Антыгітлераўская дэманстрацыя ў Аўстрыі.

ЛЯСЫ І ІХ УГОДДЗІ— НА СЛУЖБУ СОВЕЦКАМУ НАРОДУ

Крывавая банда фашысцкіх гадаў, якая, ізуіцка маскіруючыся і двурушнічаючы, ўкрапаўзала ў партыйныя, совецкія і земельныя органы Совецкай Беларусі, не мала нашкодзіла ў сельскай гаспадарцы.

Каб нашкодзіць калгаснаму сялянству, каб выклікаць недавер'е мас да нашай партыі і совецкай улады, подлыя рэстаўратары белапольскага бізуна і памешчыка незаконна адбіралі ў калгасаў належачыя ім лясы, пазбаўлялі іх магчымасці карыстацца лясными ўгоддзямі. Залыхаючыся ў сваёй звярынай злобе да гераічнага беларускага народа, шпіёнская падаль па заданню польскай контрразведкі пазбаўляла сялянства апалу, пасьбішч, будаўнічых матэрыялаў і т. д.

Гістарычная пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб аказанні дапамогі калгаснаму сялянству Беларускай ССР і аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў справе калгаснага ўпаралкавання нанесла сакрушаючы ўдар па шкодніцкай дзейнасці зграі польскіх шпіёнаў у сельскай гаспадарцы Совецкай Беларусі. Падпісаная таварышамі Молатавым і Сталіным пастанова з'яўляецца бліскучым узорам большэвіцкай барацьбы за ліквідацыю вынікаў шкодніцтва. Гэта пастанова, у прыватнасці, пускае пад адкос шкодніцкія планы і наводзіць большэвіцкі парадак у справе карыстання калгасаў лясными ўгоддзямі.

З лясоў дзяржаўнага і мясцовага значэння перадаецца калгасам, з занясеннем у акты на вечнае карыстанне зямлёй, 480 тысяч гектараў лясных угоддзяў. Калгасам, калгаснікам і аднаасобніхам дазволена бесперашкодна пасвіць жывёлу ў лясах як дзяржаўнага, так і мясцовага значэння, за выключэннем плошч, занятых лесарассадзнікамі, а таксама маладняком на плошчах, дзе арганізавана лесаўзнаўленне.

Скасован існаваўшы ў БССР шкодніцкі парадак продажу лесу, пры якім калгаснікі, якія жывуць у лясных раёнах, былі пазбаўлены магчымасці купіць лес. Устаноўлен новы парадак водпуску лесу. Водпуск лесу, вызначанага дзяржавай для сялян, праводзіцца шляхам продажу ўпаўнаважаным лесгаса сялянам лесарубчых білетаў у сельсоветах.

У 1938 годзе з лясоў дзяржаўнага і мясцовага значэння калгасам і калгаснікам адпускаецца да 800 тысяч кубаметраў дзелавога лесу і да 1,2 мільёнаў кубаметраў дроў.

Гэтай-жа пастановаю СНК СССР і ЦК ВКП(б) з калгаснікаў знімаецца 15 мільёнаў рублёў, якія лічацца за імі нядоімкамі па штрафах за парушэнне правіл лесакарыстання. Надалей устаноўлен такі парадак, што «накладанне штрафаў за парушэнне ўстаноўленага парадку лесакарыстання праводзіцца па рашэнню Народнага суда, згодна акту, складзенага лясной аховай».

Кожны пункт гэтай гістарычнай пастановы з'яўляецца ўзорам сапраўды большэвіцкай, сталінскай чуласці і клопатаў аб совецкім народзе.

Цяпер уся справа ў хуткім большэвіцкім ажыццяўленні гэтай пастановы. Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б аб перадачы калгасам лясных угоддзяў вызначае парадак і тэрміны вызялення ў натуры лясных плошч, якія павінны быць перададзены калгасам, зацвярджае параённае размеркаванне перадачы лясных угоддзяў дзяржаўнага і мясцовага значэння, размяркоўвае адпушчаныя калгасам на 1938 год дзелавую драўніну і дровы. Для вызначэння і перадачы калгасам лясных плошч у раёнах вызначаюцца камісіі. Рашэнні камісіі абмяркоўваюцца на агульных сходах калгаснікаў і потым зацвярджаюцца пленумам райвыканкома.

Перадача лясоў калгасам з занясеннем у акты на вечнае карыстанне зямлёй павінна быць закончана не пазней 1 верасня 1937 г. Партыйныя, совецкія, земельныя і лясныя арганізацыі пазінны неадкладна прыступіць да правядзення гэтай работы і забяспечыць правільнае размеркаванне лясных угоддзяў. Вынікі шкодніцтва павінны быць ліквідаваны неадкладна.

Гістарычная пастанова Саюза ССР і ЦК ВКП(б) многаму абавязвае калгасы і калгаснікаў. Яны, у прыватнасці, абавязаны забяспечыць узорнае захаванне дзяржаўных правіл лесакарыстання і лесаўзнаўлення ў лясах, якія ім перадаюцца; яны пазінны праводзіць лесанасаджэнні ў размерах не менш вырубаемых плошч. Трэба дань рашучы ашпор варожым элементам, якія прабуюць паварварску знішчаць і разбазарваць лясныя ўгоддзі. Не можа быць ніякага сумнення, што калгаснае сялянства совецкай Беларусі здолее навесці большэвіцкі парадак у справе эксплаатацыі перададзеных ім лясоў.

Лес! Беларускае сялянства добра памятае, з якімі пакутамі для працоўных звязана гэта слова ў мінулым. З лясного матэрыялу сяляне сваімі рукамі зымушаны былі будаваць палацы і маёнткі памешчыкам. Памешчыкі заглядвалі ў лес для палявання, на апачынак, але сюды не смела ступаць нага бедняка-селяніна. Ягады ці грыбы селянін сабраў у лесе, палена высек, каб разагрэць азябшых у поўразваленай хаціцы дзяцей — за гэта штрафы, забранні маемасці, бізун і мардабойства. Вось аб аднаўленні гэтых парадкаў марылі заклятыя ворагі народу, канечнай мэтай якіх было — вярнуць панаванне памешчыкаў, капіталістаў.

Ворагі народа пралічыліся. Вялікая Кастрычніцкая социялістычная рэволюцыя назаўсёды пакончыла з гэтымі жудаснымі парадкамі эксплаататараў - крывапійцаў. Зямля і яе нетры, фабрыкі, заводы, лясы — усё гэта стала здабыткам социялістычнай дзяржавы, усяго совецкага народа. Гэтыя багацці служаць і будуць служыць совецкаму народу. Наш лес дае і будзе даваць будаўнічы матэрыял для новабудоўляў — социялістычных гігантаў, для будаўніцтва калгасаў і калгаснікаў. Ён дасць апал нашым гаралам і вёскам, пасьбішчы калгаснай жывёле. Тут, у лесе, будуюцца і будуць будавацца санаторыі і дамы адпачынку для гаспадароў лесу — совецкага народа. Тут, у лесе, будзе наведзен большэвіцкі парадак. За правільным выкарыстаннем лясных угоддзяў зорка сочыць гаспадарчае зока совецкага народа.

Нашы лясы, нашы землі абмыты кроўю лепшых сыноў беларускага народа, кроўю сыноў усіх народаў вялікага Совецкага Саюза, якія прышлі на дапамогу беларускаму народу ў самыя цяжкія для яго хвіліны, калі ўзброеныя да зубоў белапольскія акупанты хацелі ў патоках крыві задушыць свабодны і шчаслівы беларускі народ. І няхай шалеюць фашысцкія шчанюкі і іх белапольскія гаспадары. Польскія шпіёны будуць знішчаны з твару совецкай зямлі! Беларускі народ, які ў гэтыя дні перажывае пачуцці вялікага ўзлыму, пачуцці бязмежнай любві да свайго вялікага і любімага Сталіна, — народ зерных патрыётаў сваёй радзімы, — такі народ ніколі не дапусціць, каб брудная нага фашысцкага акупанта ступіла на свяшчэнную совецкую зямлю, каб крыважэрныя кіпцюры фашысцкага звяр'я ўчапіліся ў яго арганізм.

«Мы просім Вас, — сказана ў пісьме ўдзельнікаў Усебеларускай нарады старшынь калгасаў да таварыша Сталіна, — наш дарагі Іосіф Вісарыёнавіч, верыць, што беларускае калгаснае сялянства ад малога да вялікага ўсе, як адзін гатовы калі напаўзе зораг, аддаць за СССР, за калгасы, за Вас, таварыш Сталін, не толькі свае сілы, але і наша жыццё».

ПЛЕНУМ МЕНСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б

Тав. ВОЛКАЎ А. А. выбран выконваючым абавязкі першага сакратара МГК КП(б)Б

Учора адбыўся пленум Менскага гаркома КП(б)Б.

Пленум выбраў выконваючым абавязкі першага сакратара Менскага гаркома КП(б)Б тав. Волкава Аляксея Аляксеевіча.

Тав. Волкаў выступіў з кароткай прамовай, у якой паставіў рад злабадненўных пытанняў работы Менскага гаркома.

У спрэчках, разгарнуўшыхся затым на пленуме, выступілі тт. Кудзельскі, Селіверстаў, Чорны, Балкоў, Папкоў, Якушаў, Драбышэўскі, Гарагляд, Пятрухін, Кірзнер, Літвін.

Выступаўшыя, крытыкуючы работу бюро гаркома, паднялі рад вострых пытанняў партыйнай работы і гарадской гаспадаркі. Асабліва падкрэслівалася неабходнасць яшчэ большага павышэння рэволюцыйнай пільнасці, хуткай ліквідацыі вынікаў шкодніцтва, у прыватнасці вострa былі пастаўлены пытанні водаснабжэння, жылёвай гаспадаркі, снабжэння горада дровамі і інш.

У заключэнне тав. Волкаў А. А. указаў, што большэвікі сталічнай партарганізацыі павінны паказаць усёй КП(б)Б прыклад авалодання большэвізмам, павышэння ўзроўню партыйнай работы сталічнай партыйнай і комсамольскай арганізацыі, выкарчаваць ворагаў з усіх нор, у якія яны забраліся, і як можна хутчэй ліквідаваць вынікі шкодніцтва ў галіне гарадской гаспадаркі.

ПРЫЁМ У ГОНАР ГЕРОЯЎ-ЛЁТЧЫКАЎ тт. ГРОМАВА, ЮМАШОВА і ДАНІЛІНА

ЛОНДАН. 14 жніўня. (БЕЛТА). Учора у паўпрэдстве СССР у Лондане адбыўся прыём у гонар герояў-лётчыкаў тт. Громава, Юмашова і Даніліна.

Усе прадстаўнікі друку, якія прысутнічалі на прыёме, аднадушна выказалі захапленне совецкімі лётчыкамі, скромнасць якіх зрабіла глыбокае ўражанне. Громаў адказваючы на пытанні прадстаўнікоў друку, заявіў, што самалёт «АНТ-25» совецкай вытворчасці і совецкай канструкцыі. Прысутныя на прыёме праявілі вялікую цікавасць да антыабледзяніцеля, бо абледзяненне самалётаў з'яўлялася прычынай многіх фатальных паветраных катастроф у Англіі. Громаў заявіў, што антыабледзяніцель на самалёце «АНТ-25» прапаваў добра, не дапускаючы абледзянення.

У адказ на пытанні, ці мае, па думцы Громава, развіццё транспалярнага паветранага шляху ваеннае значэнне, тав. Громаў заявіў, што ножніцы звычайна з'яўляюцца простым мірным сродкам, але ў выпадку неабходнасці яны могуць быць выкарыстаны як зброя.

МАСКВА—ПАЎНОЧНЫ ПОЛЮС—ПАЎНОЧНАЯ АМЕРЫКА

ХОД ПЕРАЛЕТУ

Учора на працягу першай паловы дня ў Штабе пералёту сістэматычна атрымліваліся весткі аб ходзе пералёту Героя Совецкага Саюза тав. С. А. Леванеўскага. Пералёт працякаў паспяхова.

У 13 гадз. 40 мін. па маскоўскаму часу самалёт «СССР—Н-209» прайшоў над Паўночным полюсам і лёг курсам на Аляску. Перадачу з самалёта прымалі берагавыя радыёстанцыі Народнага камісарыята сувязі СССР і Галоўнага кіраўніцтва Паўночнага морскага шляху.

У 14 гадз. 32 мін. з самалёта была перадана радыёграма, у якой паведамлялася, што крайні правы матор выбыў са строю з-за сапсавання маслапроводу; вышыня палёту 4.600 метраў пры сутэльнай воблачнасці. К гэтаму-ж часу самалёт, выпрацаваўшы некалькі тон гаручага, быў настолькі аблягчон, што мог пралажаць палёт без зніжэння на трох маторах.

Пасля гэтага рэгулярная сувязь з самалётам парушылася.

У 15 гадз. 58 мін. па маскоўскаму часу Якуцкая радыёстанцыя прыняла наступнае паведамленне з самалёта: **«Усё ў парадку. Чутнасць Р—1»** (што азначае дрэнная).

Потым у **17 гадз. 53 мін.** радыёстанцыя мыса Шміта прыняла з самалёта наступную радыёграму: **«Як мяне чуеце? РЛ** (пазыўныя самалёта Леванеўскага). **Чакайце».**

Па просьбе Народнага камісарыята сувязі СССР усе ваенныя, камерчаскія і аматарскія радыёстанцыі Паўночнай Амерыкі вядуць бесперапынны нагляд за эфірам, слухаючы пазыўныя і перадачы з совецкага самалёта. Адначасова бесперапынны нагляд вядуць паўночныя і далёкаўсходнія совецкія радыёстанцыі. Паміж Масквой і Вашынтонам, а таксама паміж Масквой—Сан-Францыска і Фербенксам падтрымліваецца рэгулярная сувязь па радыётэлефону і тэлеграфу. Народны камісар сувязі СССР тав. І. А. Халепскі кожныя поўгадзіны гаворыць па радыётэлефону з саветнікам паўпрэдства СССР у ЗША тав. Уманскім.

Аднак да 2 гадзін 14 жніўня сувязі з самалётам «СССР—Н-209» аднавіць не ўдалося.

АД УРАДАВАЙ КАМІСІІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ ПЕРАЛЁТАЎ МАСКВА—ПАЎНОЧНАЯ АМЕРЫКА

Як учора паведамлялася, пералёт Героя Совецкага Саюза тав. С. А. Леванеўскага на самалёце «СССР Н-209» працякаў у вельмі цяжкіх атмасферных умовах. Самалёту з-за высокай сутэльнай воблачнасці даводзілася лячыць на вялікай вышыні, да 6.000 метраў. У 14 гадзін 32 мінуты выбыў са строю адзін з маторaў, і самалёту дазялося знізіцца да 4.600 метраў. З таго часу поўных радыёграм з самалёта не прынята. З прынятых урыўкаў тэлеграм відаць, што самалёт яшчэ некаторы час пралажаў шлях. Можна думаць, што, вымушаны ляцець у воблаках, самалёт мог падвергнуцца абледзяненню, што прывяло да вымушанай пасадкі на лёд. Умовы ільду ў раёне полюса і за ім з'яўляюцца параўнаўча спрыяючымі для такой пасадкі. Усе палярныя радыёстанцыі прадаўжаюць безупынна слухаць на хвалі самалёта. Некалькі разоў радыёстанцыі чулі работу на хвалі самалёта тав. Леванеўскага, але з-за слабай чутнасці нічога пэўнага прыняць не ўдалося.

Экіпаж самалёта «Н-209» забяспечан харчамі на паўтара месяца, а таксама палаткамі, спальнымі мяшкамі, цёплай вопраткай і зброяй.

Абмяркоўваючы станозішча, урадавая камісія прыняла рад мер для неадкладнага аказання дапамогі. Дапамога арганізуецца ў двух напрамках: ва ўсходнім і ў заходнім сектарах Арктыкі.

Па ўсходняму сектару, з боку Чукоцкага поўвострава, прыняты наступныя меры:

1. Ледаколу «Красін», які знаходзіцца каля берагоў Чукоцкага мора, дан загад неадкладна накіравацца да мыса Шміта, дзе знаходзіцца авіябаза Галоўнаўночморшляху, узяць на борт тры самалёты з экіпажамі і гаручым, накіравацца ў раён мыса Бароу на Аляскі і адтуль на поўнач, наколькі дазволяць ільды, дзе і служыць базай.

2. Параходу «Микоян», які знаходзіцца ў Берынгавым моры, загадана з поўным грузам вугалю накіравацца да «Красина».

3. Двухматорны гідрасамалёт «СССР Н-2» лётчыка Задкова, які знаходзіцца ў бухце Нагаева, атрымаў загад неадкладна накіравацца ў Уэлен і адтуль да месца «Красина».

Па заходняму сектару, апіраючыся на авіябазу вострава Рудольфа і станцыю «Паўночны полюс» тав. Папаніна, даны наступныя ўказанні:

1. Падрыхтаваць да вылету тры самалёты АНТ-6, якія вярнуліся з полюса ў Маскву. Гэтыя самалёты пад камандаваннем Герояў Совецкага Саюза тт. **Вадап'янава, Молакава і Алексеева** накіроўваюцца на востраў Рудольфа, а адтуль у раён Паўночнага полюса.

2. Палярная станцыя Папаніна, якая знаходзіцца ў сучасны момант на нулявым мерыдыяне і шырацe 87 градусаў 20 мінут, будзе ператворана ў авіябазу — выходную кропку для пошукаў — шляхам перакідвання гаручага з вострава Рудольфа на самалётах АНТ-6.

На запытанне камісіі тав. **Папаніна** адказаў, што яго поле захавалася поўнасцю і пасадка самалётаў магчыма.

3. Двухматорным самалётам «СССР Н-206» Героя Совецкага Саюза тав. **Галавіна** і «СССР Н-207» лётчыка **Грацыянскага** дана прапісанне вылецець на востраў Дзіксон і быць там у рэзерве для вылету на Поўнач у заходні ці ўсходні сектар Арктыкі, глядзячы па неабходнасці.

Уся сетка радыё і метэастанцый працаўжае работу.

Урадавая Камісія.

НАПЯРЭДАДНІ ЎСЕСАЮЗНАГА ДНЯ АВІЯЦЫІ

Усесаюзны дзень авіяцыі ў Менску і іншых гарадах рэспублікі будзе адзначан масоўкамі працоўных. Маладыя вучлёты будуць дэманстраваць свае поспехі. Заклік менжыцяў — даць краіне дадаткова 150 тысяч пілотаў—знайшоў гарачы водгук сярод моладзі рэспублікі. Менскі аэраклуб імя Молакава рыхтуе ў два разы больш пілотаў чым у мінулым годзе. У менскую школу пілотаў без адрыву ад вытворчасці было падана на кожнае месца 7 заяў.

Усе маладыя вучлёты атрымалі права самастойнага кіравання самалётам. З ліку лепшых пілотаў, скончыўшых школу, менскі аэраклуб вырасціў інструктароў.

У СОУНАРКОМЕ БССР

На сваім апошнім пасяджэнні Совет Народных Камісараў БССР заслухаў інфармацыю аб ходзе падрыхтоўкі ільназаводаў да новага сезона і адзначыў, што ільназаводы не гатовы да прыёму і апрацоўкі ільнатрасты ўраджаю 1937 года. Наркамлегпром і трэсты не ажыццяўляюць аператыўнага кіраўніцтва ільназаводамі. Асабліва дрэнна абстаіць справа на заводах віцебскага ільнатрэста.

Соўнарком устанавіў канчатковы тэрмін для завяршэння рамонту заводаў — 1 верасня бягучага года. Будаўніцтва новых шох павінна быць закончана да 15 верасня. Упаўнаважанаму камітэта загатовак даручана да 20 жніўня прадставіць узоры ільнатрасты па кожнаму раёну.

На пасяджэнні заслухан даклад камісіі аб электразабеспячэнні горада Гомеля. Пасля абмену думак Соўнарком рашыў пашырыць існуючую гомельскую цэнтральную электрастанцыю і даручыў гомельскаму горсовету і Наркомгасу ў двухмесячны тэрмін прадставіць на зацвярджэнне Соўнаркома праект пашырэння станцыі.

Зацверджана канчатковая сума на будаўніцтва і абсталяванне менскай гаспіталіцы ў размеры 3.225.000 рублёў. Соўнарком абавязаў Менскі горсовет і Белкомунбуд закончыць будаўніцтва гаспіталіцы да 1 лістапада бягучага года.

Соўнарком дазволіў Менскаму горсовету выдаткаваць з сум разервнага фонда па мясцозаму бюджэту 1.500.000 рублёў на дабрабыт горада, у першую чаргу на рамонт жыллёвага фонда. Віцебскаму горсовету на гэтыя-ж мэты вызначана 650 тыс. рублёў. Старшыням Менскага і Віцебскага горсоветаў даручана абмеркаваць на секцыях горсоветаў мерапрыемствы па эфектыўнаму скарыстанню гэтых сродкаў.

На гэтым-жа пасяджэнні Соўнарком заслухаў інфармацыю аб ходзе будаўніцтва тэатра оперы і балета.

СНК зацвердзіў канчатковую суму на будаўніцтва тэатра ў 13.200 тыс. рублёў і намеціў рад мерапрыемстваў, якія пазінны забяспечыць сканчэнне гэтага будаўніцтва ва ўстаноўлены тэрмін к 20 гадавіне вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі. Белкомунбуду даручана неадкладна накіраваць на будаўніцтва тэатра дадаткова 400 рабочых. Менскі горсовет павінен распрацаваць праект і прыступіць да планіроўкі плошчы тэатра.

Соўнарком зацвердзіў канчаткозы праект пабудовы кіностудыі Белдзяржкіно і ўстанавіў кошт гэтага будаўніцтва ў суме 22,5 млн. рублёў.

ВАЕННЫЯ ПАДЗЕІ Ў ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ

ЖОРСТКІЯ БАІ НА ВУЛІЦАХ ШАНХАЯ

ЖЫЦЦЕ ШАНХАЯ ПАРАЛІЗАВАНА ВАЕННЫМІ ДЗЕЯННЯМІ

ШАНХАЙ, 14 жніўня. (БЕЛТА). Жыццё Шанхая ўчора было паралізавана ваеннымі дзеяннямі. Частковая перастрэлка паміж японскімі і кітайскімі часпамі адбывалася яшчэ напярэдадні ноччу. 6 японскіх маракоў з аўтамабіля абстралялі кітайскіх вартавых на граніцы Чапея (раён Шанхая). Каля 8 гадзін раніцы група ўзброеных японскіх разведчыкаў адкрыла агонь па кітайскіх вартавых у раёне Паўночнага вакзала. У 9 гадзін 13 мінут атрад японскіх маракоў павёў наступ на кітайскія пазіцыі, прабуючы адцясніць кітайскія войскі да лініі чыгункі, пачынаючы ад Паўночнага вакзала да казармаў Баньбэнчан. Кітайскія перадавыя часці аказалі рашучае супраціўленне. У рэзультаце японцы адступілі ў Хонк'ю (раён Шанхая). Вулічныя баі прадаўжаліся поўгадзіны. Забіта 5 японцаў і больш 10 ранена. Ранены адзін кітайскі салдат і прахожы. У сутычцы прымалі ўдзел тры японскія бранавікі. З абодвух бакоў былі пушчаны ў ход кулямёты. Каля 12 гадзін японскія маракі абстрэльваліся кітайскімі снайперамі з пустых памяшканняў і з даху дамоў на некалькіх вуліцах Хонк'ю. Некалькі невялікіх сутычак адбылося таксама ззаду японскіх могілак уздоўж канала Хонк'ю—Крык. Затым як быццам наступіла зацішша, якое ў 4 гадзіны змянілася артылерыйскай стральбой у раёне Паўночнага вакзала. Кітайскія войскі падзяргаюць артылерыйскаму абстрэлу раён японскіх казармаў. Кананада пралаўжаецца.

Супраціўленне японскаму ўтаржэнню аказвае 88-я дывізія. 87-я дывізія размешчана на першай станцыі ад Шанхая. Над раёнам ваенных дзеянняў лятаюць японскія і кітайскія самалёты. Агенцтва Домей Пусін паведамляе, што рака Янцзы блакіравана кітайцамі каля Цзінцзяна (на паўночны захад ад Шанхая).

ТРОХДЗЁННЫ БОЙ У РАЁНЕ ЦЗІНЬХОЧЭНЯ

ТОКІО, 13 жніўня. (БЕЛТА). Цяньцзінскі карэспандэнт Домей Пусін сцвярджае, што пасля заняцця японцамі горада Нанькоу кітайскія войскі адступілі на другую лінію абароны на подступах да перавалу Нанькоу (на Паўночны ўсход ад горада) і прадаўжаюць аказваць супраціўленне японскім войскам.

Японскае камандаванне толькі 12 жніўня апублікавала некаторыя даныя аб буйнейшым баі з пачатку ваенных аперацый у Паўночным Кітаі, які прадаўжаўся тры дні ў раёне Цзіньхочэня (у 20 клм. на поўнач ад Бэйпіна). Бой пачаўся 27 ліпеня і закончыўся толькі 29 ліпеня. Японскія войскі не раз атакавалі пазіцыі двух кітайскіх палкоў 29-й арміі, страцілі ў баях звыш 100 салдат забітымі і раненымі і змаглі заняць кітайскія пазіцыі толькі па прыбыцці падмацаванняў.

ЗАЯВА ВАН ЦЗІН-ВЕЯ

НЬЮ-ЁРК, 13 жніўня. (БЕЛТА). У інтэрв'ю з карэспандэнтам агенцтва Юнайтэд прэс у Нанкіне Ван Цзін-вей заявіў, што канечным аб'ектам японскай агрэсіі ў Кітаі з'яўляюцца інтарэсы ЗША і Англіі, бо падначаліўшы Кітай, Японія павялае наступ супроць ЗША і Англіі ў Кітаі. Інтарэсы ўсеагульнага міру патрабуюць, каб ЗША і Англія ў сучасны момант «дзейнічалі сумесна па адзінай абарончай лініі». Ван Цзін-вей заявіў, што Чан Кайшы поўнасцю раздзяляе гэты пункт гледжання.

Кранаючыся меркаванняў аб уходзе ЗША з Далёкага Ўсхода, Ван Цзін-вей сказаў: «Ці жадае гэтага Амерыка ці не, ход падзей нязменна ўказвае на тое, што ЗША і Японія сутыкнуцца тварам да твару па пытанню аб панаванні на Тіхім акіяне». ЗША выйграл-б, калі-б «у сучасны момант пайшлі ў нагу з Англіяй, СССР і Францыяй у справе абароны міру на Тіхім акіяне. Сучасны момант з'яўляецца падыходзячым для такога альянса, калі Кітай гатоў афяраваць сабой для справы міру, ведучы з Японіяй вайну, якая вычарпае ўсе рэсурсы Японіі, уключаючы і людскія».

ПАЖАРЫ Ў ЧАПЕІ

ТОКІО, 14 жніўня. (БЕЛТА). Баі ў Шанхаі, якія адбываліся 13 жніўня, заціхлі к 9 гадзінам вечара. З новай сілай баі разгараліся сёння ў 2 гадзіны раніцы. У рэзультаце японскай бамбардыроўкі ў многіх мясцах Чапея ўзніклі пажары, якія прымаюць з прычыны моцнага ветру буйныя размеры. Гарыць таксама Паўночны вакзал, запалены японскімі бомбамі. Гарэць і Усунскія прыстані, падпаленыя кітайскімі войскамі з мэтай папярэджання высадкі японскіх падмацаванняў.

БЕСПАСПЯХОВАЯ АТАКА ЯПОНЦАЎ НА ТУЛЮЧЭНЬ

ШАНХАЙ, 14 жніўня. (БЕЛТА). Цзіньаньскі карэспандэнт агенцтва Сентрал ньюс перадае з фронта, што ў беспаспяховай атацы японцаў 13 жніўня на Тулючэнь (на паўднёвы захад ад Цяньцзіня, на Цяньцзін—Пукоўскай чыгунцы) прымаў удзел таксама атрад карэйска-манжчоугоскіх войскаў. Атака была адбіта кітайскімі войскамі. Японцы былі зымушаны адступіць, пакінуўшы звыш 100 забітых.

Пасля поспеху, дасягнутага 12 жніўня, кітайскія войскі сёння выбілі японцаў з іх пазіцый у Лянванчуане (у 4 клм. ад Тулючэня).

Не гледзячы на жорсткую паветраную бамбардыроўку, якой японцы падверглі кітайскія пазіцыі, кітайскія войскі панеслі вельмі нязначныя страты. Авангарды кітайскіх войск дасягнулі сёння пасля абеда Янлуцына (у 24 клм. ад Цяньцзіна, на Цяньцзін-Пукоўскай чыгунцы). Пасля сутычкі з японскімі войскамі кітайцы захапілі шмат узбраення і амуніцыі.

Японскія самалёты сёння зрабілі некалькі палётаў на Дэчжоу, Цзінань і Тайань (усе пункты ў правінцыі Шаньдун).

***

ШАНХАЙ, 14 жніўня. (БЕЛТА). Авангарды кітайскіх войск на Бэйцін-Ханькоускай чыгунцы, у рэзультаце некалькіх сутычак, 13 жніўня вечарам уступілі ў горад Лянсян. На вуліцах ідуць баі паміж кітайскімі і японскімі войскамі.

***

ШАНХАЙ, 14 жніўня. (БЕЛТА). 12 жніўня па загаду штаба Шанхай-Усунскага гарнізона расстраляна 6 кітайцаў — японскіх шпіёнаў па абвінавачванню ў стварэнні беспарадкаў у горадзе. 13 жніўня расстраляна 8 японскіх шпіёнаў.

***

ШАНХАЙ, 14 жніўня. (БЕЛТА). Артылерыйская стральба каля 9 гадзін вечара 13 жніўня спынілася. У 4 мясцах у Хонк'ю ўспыхнулі пажары. Па заяве японскага морскага аташэ, кітайская артылерыя разбурыла ў Чапеі тры масты.

У 10 гадзін 20 мінут сёння 9 кітайскіх самалётаў бамбардыравалі японскія ваенныя караблі, якія стаяць на рацэ Ванпу. Караблі адказалі артылерыйскім агнём. Бой прадаўжаецца.

***

НЬЮ-ЁРК, 13 жніўня. (БЕЛТА). Як перадае Юнайтэд прэс з Сан-Францыска, трансціхаакіянская радыётэлефонная сувязь з Шанхаем часова спынена.

ПАВЕТРАНЫ БОЙ ПАМІЖ ЯПОНСКІМІ І КІТАЙСКІМІ САМАЛЁТАМІ

ШАНХАЙ, 14 жніўня. (БЕЛТА). У 4 гадзіны дня кітайская авіяцыя пачала інтэнсіўную бамбардыроўку раёна Хонк'ю і стаянку японскіх ваенных суднаў. Японцы адказалі моцным агнём з зянітных гармат, устаноўленых на самых высокіх будынках. Праз 30 мінут пачаўся паветраны бой паміж японскімі і кітайскімі самалётамі.

Паветраны бой закончыўся каля 6 гадзін. Некалькі бомб японцамі скінута ў памяшканне тэатра, дзе знаходзілася некалькі тысяч кітайскіх бежанцаў. Сотні грузавікоў і пажарных аўтамабіляў развозяць у розныя канцы горада трупы забітых мірных жыхароў. У горадзе некалькі тысяч раненых. Бамбардыроўцы падвергнуся цэнтральная вуліца міжнароднага сэтльмента Нанкін-Род. Бомбы трапілі ў некалькі буйных гасцініц. Па гораду бродзяць сотні тысяч бязломных бежанцаў. Бой прадаўжаецца ў раёнах Чапея і Цзяньваня. У некалькіх мясцах усцыхнулі пажары.

ПЕРШЫ МОЦНЫ УДАР ЯПОНСКІМ ВОЙСКАМ

ШАНХАЙ, 14 жніўня. (БЕЛТА). Баодынскі карэспандэнт агенцтва Сентрал ньюс паведамляе, што японскім войскам учора быў нанесен першы моцны ўдар пры атацы, якую яны прадпрынялі на горны праход Нанькоў, які з'яўляецца важным стратэгічным пунктам Бэйпін-Сінюаньскай чыгункі. Пасля неаднаразовых беспаспяховых спроб захваціць горны праход, японцы ўчора вечарам адступілі, пакінуўшы шмат забітымі. Атакі вяліся японцамі пры падтрыманні 30 бамбардыроўшчыкаў, 60 палявых гармат і 30 танкаў.

ПАПРАЎКА

У паведамленні **«Да налёту на совецкае консульства ў Цяньцзіне»** (гл. «Звязду» ад 14 жніўня) у другім абзацы, у восьмым радку **трэба чытаць:** «... ад сумеснага расследвання, якое было-б зроблена на парытэтных...» і далей, як у тэксце.

(БЕЛТА).

КОЖНЫ КАЛГАСНЫ ДВОР ПАВІНЕН АТРЫМАЦЬ УСТАНОЎЛЕНЫ ПА НОРМЕ ПРЫСЯДЗІБНЫ ЎЧАСТАК

ПАКОНЧЫЦЬ З БЕЗАДКАЗНАСЦЮ

Сёння канчаецца вызначаны пастановай Соўнаркома Саюза і ЦК ВКП(б) тэрмін надзялення калгасных двароў прысядзібнымі ўчасткамі па ўстаноўленай норме. Аднак, паводле вестак на 13—14 жніўня, няма яшчэ ні аднаго раёна ў рэспубліцы, дзе-б была поўнасцю закончана работа па нарэзцы калгаснікам прысядзібных участкаў. Праўда, група раёнаў як Грэск, Крупкі, Старобін, Мазыр, і некаторыя другія надзялілі выяўленую колькасць калгасных двароў, якія не мелі мінімальнай нормы прысядзібнай зямлі.

Аднак з гэтых раёнаў няма ніякіх вестак колькі выяўлена калгасных двароў, якія мелі прысядзібныя ўчасткі больш мінімальнай, але не перавышаючы максімальнай нормы і ў якіх частка сядзіб была незаконна адрэзана. Не выяўлены яшчэ ўсе такія гаспаларкі і не звернута ім незаконна адабраная прысядзібная зямля. Тады як колькасць зямлі, вызначанай для поўнай і частковай нарэзцы прысядзібных участкаў у большасці раёнаў не выкарыстоўваецца, нават і ў тым, якія лічаць надзяленне калгаснікаў прысядзібнай зямлёй закончаным.

У некаторых раёнах яўна зрываецца выкананне ў вызначаныя тэрміны пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б). Так, па Хойніцкаму раёну, паводле вестак, паступіўшых у ЦК КП(б)Б, не надзелены яшчэ 900 калгасных двароў.

У Клічаўскім раёне з 276 калгасных двароў, якія не маюць мінімальнай нормы прысядзібнай зямлі, нарэзаны прысядзібныя ўчасткі толькі 146 дварам.

Па Веткаўскаму раёну з 500 выяўленых гаспадарак, якія не маюць мінімальнай нормы прысядзібнай зямлі, надзелены толькі 120 двароў.

З 5749 гаспадарак па Глускаму раёну надзелены прысядзібнай зямлёй да мінімальнай нормы 2.420 гаспадарак.

У Пухавіцкім раёне з 2.058 гаспадарак надзелены толькі 593.

Такая злачынная маруднасць у выкананні важнейшай пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) сведчыць, што сакратары гэтых райкомаў тт. Герцовіч, Цімкевіч, Кожар, Краўчанка, Фомін не зразумелі ўсёй сур'ёзнасці задачы, пастаўленай зараз перад КП(б)Б—гэта хутчэйшая ліквідацыя вынікаў шкодніцкай дзейнасці польскіх шпіёнаў.

Для кожнага партыйна-савецкага кіраўніка ў нашай рэспубліцы няма зараз больш важнай задачы, як барацьба за выкананне ва ўстаноўленыя тэрміны гістарычнай пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б), за хутчэйшую ліквідацыю вынікаў шкодніцтва. І той, хто не хоча зразумець гэтага, хто не змагаецца па-большэвіцку за канчатковае выкарчоўванне ворагаў, хто не ліквідуе вынікі іх шкодніцтва, робіць вялікае злачынства перад партыяй, перад краінай.

Кіраўнікі партыйна-савецкіх арганізацый павінны прадпрыняць зараз усе меры, каб поўнасцю выканаць пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б), надзяліць усе калгасныя двары прысядзібнай зямлёй па ўстаноўленай норме, разгарнуць як след работу па ліквідацыі па-шкодніцку арганізаваных соўгасаў, перадачу іх зямель у карыстанне калгасам, адвядзенне для калгасаў лясоў і ажыццяўленню ўсіх ільгот, прадугледжаных пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б).

У ЛЕПЕЛЬСКАЙ АКРУЗЕ НЕ ВЫКОНВАЮЦЬ ПАСТАНОВЫ СНК СССР І ЦК ВКП(б)

Не гледзячы на тое, што тэрмін надзялення калгаснікаў прысядзібнымі ўчасткамі прайшоў, работа гэта па Лепельскай акрузе далёка незакончана. Як акруговыя, так і раённыя партыйныя і савецкія арганізацыі не забяспечваюць своечасовага выканання пастановы партыі і ўрада.

У Бягомльскім раёне на 14 жніўня работа па надзяленню калгаснікаў закончана толькі ў 3 сельсоветах: Асаўскім, Нідальскім, Бягомльскім. Прысядзібныя ўчасткі атрымалі толькі 163 калгасных гаспадаркі. Сакратар райкома партыі т. Дзяч, старшыня райвыканкома т. Шэмпель да сёнешняга дня не ведаюць, колькі яшчэ асталося гаспадарак, у якіх прысядзібныя ўчасткі не маюць мінімальных норм.

Вельмі марудна праходзіць надзяленне калгаснікаў прысядзібнымі ўчасткамі ва Ўшацкім раёне. У калгасе «Прагрэс», Маладоліцкага сельсавета не надзелены калгаснікі Тарасевіч Ольга, якая мае ўсяго 0,13 гектара, Зінькевіч Франц — 0,20 гектара. Да гэтага часу не вырашана пытанне аб незаконным адрэзе ўчасткаў у калгаснікаў Тарасевіч Уладзіміра і Усевіча Івана, праведзеным шкоднікамі ў 1936 годзе.

Не лепш абстаіць справа ў Масырскім сельсавеце гэтага раёна. Старшыня сельсавета Клігаўка нават не мае зестак колькі калгаснікаў патрэбна надзяліць прысядзібнымі ўчасткамі. Такі малюнак назіраецца ў Вацлаўскім сельсавеце, (старшыня Беразін). Тут высветлілася, што 13 гаспадарак, якія лічыліся надзялёнымі, не маюць участкаў зямлі нават мінімальнай нормы, згодна статута сельгасарцелі.

Ушацкі райком партыі (сакратар т. Волкаў) слепа верыць хлуслівым весткам старшынь сельсаветаў і ўпаўнаважаных РК і РВК. Яркім прыкладам таго, што ў ўшачах няма большэвіцкай барацьбы па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў справе калгаснага ўпарадкавання сведчыць наступны факт. 13 жніўня да загадчыка райзямаддзела Клопава прышлі 40 калгаснікаў са скаргамі аб няправільным надзяленні іх агародамі.

Яшчэ некалькі дзён таму назад у Лепельскім раёне меркавалі рапартаваць аб заканчэнні надзялення калгаснікаў. Аднак, як зараз высветлілася, у радзе калгасаў не толькі не закончылі надзялення калгаснікаў прысядзібнымі ўчасткамі, але нават не прыступілі да гэтай важнейшай работы. Да такіх калгасаў адносяцца «Чырвонае забалоцце», «Совецкая Беларусь», «Ударнік» і імя Войкава. У калгасе «Чырвоныя Мацюшы», Стайскага сельсавета, выяўлена, што калгаснікі Дзівін М. і Барадзейка Матруна маюць толькі па 0,18 га прысядзібнай зямлі. Вык Мікола — 0,7 га, Дзівін Пётр — 0,22 га. У некаторых калгасах яшчэ нават не распрацавана пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б).

Акруговы земельны аддзел (выконваючы абавязкі загадчыка т. Бабіч) зусім ухіліўся ад гэтай важнейшай работы. У акрэ нават няма вестак аб ходзе надзялення калгаснікаў прысядзібнымі ўчасткамі.

Партыйныя і совецкія арганізацыі Лепельскай акругі праяўляюць злачынную маруднасць у надзяленні калгасных гаспадарак прысядзібнымі ўчасткамі, сарвалі выкананне пастановы СНК Саюза ССР і ЦК ВКП(б) у тэрмін.

Усё гэта сведчыць аб тым, што ў Лепельскай акрузе няма большэвіцкай барацьбы па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва.

Б. ПЯРКОЎСКІ.

Калгаснікі БССР глыбока вывучаюць пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб аказанні дапамогі калгаснаму сялянству Беларускай ССР і аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў справе калгаснага ўпарадкавання. НА ЗДЫМКУ: настаўнік Брагінскай сярэдняй школы чытае калгаснікам арцелі «3-ці рашаючы» газету «Звязда» з пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б). Фото Цэлуйка (БСФ).

ВЯЛІКІ ТВОРЧЫ ЎЗДЫМ У КАЛГАСАХ БЕЛАРУСІ

(Па пісьмах калгаснікаў)

У рэдакцыю працягваюць паступаць рэзалюцыі і пісьмы калгаснікаў з адабрэннем гістарычнай пастановы СНК Саюза ССР і ЦК ВКП(б). Шырокія масы калгаснага сялянства Совецкай Беларусі адказваюць на дапамогу комуністычнай партыі і совецкай улады, на бацькоўскія клопаты вялікага і любімага правадыра таварыша Сталіна новым вытворчым уздымам.

* * *

Старшыні калгасаў, брыгадзіры і загадчыкі ферм Мсціслаўшчыны ў рэзалюцыі раённай нарады пішуць:

«Ад імя ўсіх калгаснікаў нашага раёна, мы абавязуемся з усёй большэвіцкай энергіяй і сталінскай настойлівасцю змагацца за ліквідацыю вынікаў шкодніцтва. Своечасова і без страт убярэм багаты ўраджай гэтага года, зыканаем лозунг правадыра таварыша Сталіна — зрабіць усе калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі.

* * *

«Заслухаўшы справаздачу старшыні праўлення аб рабоце Ўсебеларускай нарады старшынь калгасаў, — пішуць у сваёй рэзалюцыі калгаснікі сельгасарцелі імя Будённага, Жарскага сельсавета (Ушацкі раён), — мы аднадушна заяўляем, што наш калгас стане непрыступнай крэпасцю абароны. А калі фашысты пасунуць сваё подлае рыла ў наш совецкі агарод, то атрымаюць знішчальны адпор, разаб'юць галовы аб бетонныя сцены нашых граніц».

Па даручэнню схода калгаснікаў: КАРОБАНЬ, СЕРПУЧЭНКА.

* * *

На агульным сходзе сельгасарцелі імя Леніна, Бацвяцкага сельсавета (Клічаўскі раён), калгаснікі горача віталі гістарычную пастанову СНК Саюза ССР і ЦК ВКП(б). Кожны калгаснік выказваў сваю вялікую падзяку роднаму і любімаму правадыру — таварышу Сталіну за бацькоўскія клопаты і дапамогу.

У адказ на пастанову партыі і ўрада калгаснікі пачалі працаваць яшчэ дружней.

Ф. КНІГА.

У ОРШЫ ЗАЦЯГВАЮЦЬ НАДЗЯЛЕННЕ ПРЫСЯДЗІБНЫМІ УЧАСТКАМІ

У Аршанскім раёне на 8 жніўня былі прырэзаны прысядзібныя ўчасткі толькі 40 калгасным гаспадаркам. З таго часу прайшло 7 дзён. Лік калгасных гаспадарак, якія надзелены прысядзібнымі ўчасткамі, амаль не павялічыўся.

Да гэтага часу кіраўнікі раёна не ведаюць нават колькі налічваецца калгасных двароў, якім неабходна дарэзаць прысядзібныя ўчасткі. Старшыня РВК Леановіч і загадчык райзямаддзела Касцюкевіч не могуць адказаць на пытанне, колькі калгаснікаў ужо атрымалі прысядзібныя ўчасткі і колькі яшчэ павінны атрымаць.

Амаль такое-ж становішча з ходам работ па перадачы калгасам зямель ліквідуемых соўгасаў. У раёне ліквідуецца 5 соўгасаў, але ні адзін калгас яшчэ не ведае дакладна колькі яму належыць атрымаць зямлі.

Не лепшая справа з перадачай калгасам лясоў. На мясцах у сельсоветах і калгасах аб гэтым яшчэ нічога не ведаюць.

Як відаць, кіраўнікі Аршанскага раёна замест настойлівай работы па хутчэйшаму ажыццяўленню кожнага пункта сталінскай пастановы, яны займаюцца толькі пустой балбатнёй і шуміхай, чым па сутнасці аказваюць паслугу замаскаваным яшчэ польскім шпіёнам, трацкістка-бухарынскім і нацыянал-фашысткім бандытам.

КАЗЕЙ, ШЧАРБОЎ.

ШКОДНІЦТВА Ў ХОЦІМСКАЙ МТС

Хоцімская МТС у мінулыя два гады на выкананню плана трактарных работ займала адно з першых месц у БССР. За гэтыя гады ў машынатрактарнай станцыі выраслі новыя стаханаўцы-трактарысты, як Чубакоў, Ячмянёў, Шайкоў, Давідзенка, Іванцзікаў і многа іншых. Усе яны добра авалодалі тэхнікай, давялі высокія нормы выпрацоўкі.

У МТС выраслі таксама цэлыя трактарныя брыгады, як, напрыклад, мая брыгада, якая займала ўвесь час перадавое месца ў рэспубліцы. Брыгада выконвала гадавое заданне на 300—380 процантаў.

Што-ж мы бачым у гэтым годзе?

Шкодніцтва, якое праводзілася ворагамі народу ва ўсёй зямельнай сістэме БССР, дае адчуваць сябе і ў нашай МТС. Шкоднікі ў нашай МТС усялякімі спосабамі падрывалі стаханаўскі рух, зрывалі работу трактарнага парку.

Вось факты, якія сведчаць аб тым, што шкодніцтва ў нашай МТС яшчэ не ліквідавана.

Выкананне плана перабленння ільну па МТС сарвана. Замест 750 гектараў выпераблена ўсяго 200. З мэтай дыскрэдытаваць машынае ільнаперабленне, ільнаперабілкі выпускаліся на зялёны лён, дзе яны не маглі працаваць, а толькі псаваліся і выходзілі са строю.

Камбайнавая ўборка ўраджаю таксама правалена. У МТС ёсць 2 паўднёвыя і 2 паўночныя камбайны. Камбайны добрыя. Але класавы вораг і тут пастараўся правесці сваю шкодніцкую падрыўную работу, накіраваную на дыскрэдытацыю камбайнаў. Выправілі камбайн на ўборку зялёнага жыта ў калгас «Баянік», дзе няма зернасушылкі. Было ўбрана і абмалочана каля 2 тон збожжа, якое без прасушкі сапсавалася. Камбайнавая ўборка была спынена.

У гэты час калгас, дзе знаходзіцца камбайн, бярэ на ўборку наёмных рабочых і плоціць ім па 3 пуды за жніво аднаго гектара. Уборка-ж камбайнам абышлася-б калгасу значна таней.

Такое-ж становішча атрымалася з малацьбой. Машыністы малатарань не былі падрыхтаваны, ставілі на машыну хто попадаўся. У выніку малацьба ставіцца пад пагрозу зрыву.

Якія-ж адносіны ў МТС да людзей, да кадраў? Стаханаўцаў у нас цкуюць, адносяцца да іх зверска.

Дырэкцыя МТС дае стаханаўцам самыя горшыя трактары. Стаханаўцу Чубакову не было дадзена гаручага для таго, каб ён не выканаў сваё абавязацельства.

Перадавым трактарыстам нашай МТС, якія працуюць на гусеніччных трактарах, за чатыры з паловай месяца не выдадзена заработная плата. У гэты-ж час адстаючым трактарыстам дырэкцыя выплочвае грошы акуратна.

Гэта шкодніцкая практыка накіравана на тое, каб выклікаць незадаволенне, падарваць стаханаўскі рух. Як вынік—лепшыя перадавыя трактарысты пакідаюць работу.

Узяць, напрыклад, такі факт. Калі скончылі веснавыя палявыя работы, мая брыгада прынялася за асваенне новых зямель. У калгасе імя Якаўлева, Батаеўскага сельсавета, агляделі плошчу ў 100 гектараў. Старшы механік Хавін і старшы агранам Маслоў далі ўказанне карчаваць дрэвы і пні не карчавальнай машынай, а прымітыўным спосабам—прама тросам да ЧТЗ. Маслоў вывеў шкалу расходу гаручага: выкарчаваць да 100 пнёў—35 кілограмаў гаручага, да 200 пнёў—50 кілограмаў, да 300 пнёў — 75 кілограмаў і т. д. Правялі раскарчоўку на плошчы ў 70 гектараў за перыяд ад 10 мая да 10 жніўня. І што вы думаеце, нашу работу апанілі. Прыехала камісія МТС і прызнала, што няма столькі пнёў, каб лічыць гэту работу раскарчоўкамі. Так тры месяцы работы прайшлі задарма. Трактарысты абураны такімі дзеяннямі дырэкцыі, якія праводзяцца з мэтай падарваць рост прадукцыйнасці працы. МТС, такім чынам, зрывае выкананне абавязацельства—ладзіць на ЧТЗ 3 тысячы гектараў, якое мы ўзялі на сябе.

Усе гэтыя шкодніцкія дзеянні праводзяцца не без ведама дырэктара МТС Шылейкі. Апошні павёў работу на развал МТС. Ён здзекуецца з трактарыстаў і рабочых, выжывае з МТС комуністаў. Пакінуў работу загадчык нафтабазы член партыі Балотнікаў, з якога Шылейка незаконна паўтара года затрымліваў грошы за нейкія 2 тоны гаручага.

Шылейка яшчэ працуючы ў Клімавіцкай МТС праславіўся там бяздушнымі адносінамі да трактарыстаў.

Аб усіх гэтых справах нашай МТС і дырэктара Шылейкі партыйная група сігналізавала райкому КП(б)Б. Але там не прыслухоўваюцца да сігналаў, не выкрываюць яўнага шкодніцтва, якое праводзілася і праводзіцца ў МТС нават і зараз.

ЧЭЧЫК ОСКАР.
Брыгадзір трактарнай брыгады.

МТС НЕ ВЫКОНВАЕ СВАЙГО ДАГАВОРУ

Калгас «Чырвоная змена», Шаршунскага сельсавета (Заслаўскі раён), маючы слабую цягавую сілу, звярнуўся за дапамогаю да МТС. Дырэктар Заслаўскай машынна-трактарнай станцыі Сукач заключыў з калгасам дагавор. Па гэтаму дагавору МТС абавязалася правесці веснавое ворыва на плошчы ў 25 гектараў. Але свайго дагавору станцыя не выканала. Весназога ворыва не зроблена ні на адным гектары. Баранаванне, культывацыя і дыскаванне праведзены на плошчы ў 135 гектараў, замест 180 гектараў паводле дагавору. У выніку — калгас затягнуў веснавую сяўбу.

Дагавор парушаецца МТС і зараз. Да асенняй сяўбы трактары пэвінны узараць 45 гектараў, а ўзаралі толькі 3 гектары папару.

Ворыва папараў у калгасе сарвана. Трактар 9 дзён прастаяў, а затым быў забран у другі калгас.

Надыходзіць сяўба азімых, а калгас не ўправіўся падрыхтаваць глебу. Гэта рэзультат таго, што Заслаўская МТС парушае выкананне свайго дагавору.

Неабходна прымусіць МТС выконваць свае дагаворы з калгасамі.

З. Т.

БОЛЬШ УВАГІ САРТАВОМУ НАСЕННЮ

У калгасах Шкуратаўскага сельсавета Брагінскага раёна насенныя ўчасткі ўбраны разам з усім ураджаем. Агранам-апрабатар Бас праявіў у гэтым поўную бяздзейнасць. Не арганізавана адпраўка снапоў у насеннлабараторыю ў Буркоўскім сельсавеце. Прымацаваны агранам МТС Савенкоў не забяспечыў ажыццяўлення гэтай работы.

Зараз насеннлабараторыя загружана снапамі, па апрабацыі працуюць усяго два чалавекі, якія своечасова не спраўляюцца з гэтай работай, а МТС прысланых агранамаў-апрабатараў скарыстоўвае на іншых работах, і ад апрабацыі адмовілася.

Справа з сартавым насеннем у раёне заблытана. З боку калгасаў, райза і раённых арганізацый на гэты ўчастак работы мала звярачаецца ўвагі. Ворагі народу з Наркамзема нямала нашкодзілі ў сельскай гаспадарцы нашага раёна, але ліквідацыя вынікаў шкодніцтва праходзіць вельмі марудна.

ПРОТЧАНКА.

ВОРАГІ ВЫВОДЗЯЦЬ СА СТРОЮ КОНЕЙ

У Лоеўскім раёне шкодніцтва ў галіне конегалоўлі не толькі не ліквідавана, а нават праводзіцца і зараз. Сэаю варожую дзейнасць шкоднікі накіравалі на падрыў больш моцных калгасаў, дзе добрае пагалоўе коней.

У калгасе «Звязда», Папоўскага сельсавета, яны зрабілі прывіўку коням ад перыплазмозы. На справе аказалася, што гэтым яны вывелі ўсё пагалоўе са строю. Пала ўжо 4 кані.

Былі ў калгасе 4 добрых сытых кані, якія лічыліся лепшымі ў раёне. Зараз яны, як і ўсё пагалоўе, у самую ўборку вывезены са строю. 26 коней зусім прападаюць. Адны прызнаюць, што гэта хвароба інфекцыйная, другія — інфлюэнцыя. Насылалі кроў у гомельскую ветэрынарна-бактэрыялагічную лабараторыю, але там чамусьці нічога не выявілі.

Просім рэдакцыю газеты «Звязда» выкрыць шкоднікаў, якія прывілі заразную хваробу нашым коням.

Старшыня калгаса **КАВАЛЕЎ.**
Член сельсавета **МІСАЧЭНКА К.,**
Рахункавод **МІСАЧЭНКА А.,**
Жывёлавод **МІСАЧЭНКА.**

ВЯЛІКІЯ АВАНСЫ НА ПРАЦАДНІ

Сёлета калгаснікі Слуцкай акругі атрымліваюць небывалыя авансы на працадні. У калгасе імя Войкава, Чырвонаслабодскага раёна, на працадні ўжо выдадзена па 2 кілограмы зернавых. Калгаснік гэтай сельгасарцелі Гарбуз Сямён атрымаў зернавых 10,3 цэнтнера, Юрчук Клім — 9,42 цэнтнера і т. д.

Калгаснікі сельгасарцелі «Першае мая», Слуцкага раёна, атрымалі на працадзень па паўтара рубля грашыма, па 700 грамаў жыта і 500 грамаў пшаніцы. Калгаснік Каплан Зіфель атрымаў авансу зернавымі звыш 4 цэнтнераў і грашыма 503 руб.

У калгасе «Пражэктар», Слуцкага раёна, атрымалі ў аванс на працадні па 2 кілограмы пшаніцы. 35 пудоў пшаніцы атрымаў калгаснік гэтай арцелі Новік Спірыдон і 28 пудоў атрымаў Кучук Ермак.

І. ВЕЧАР.
І СЫМАН.

НОВЫ РЭКОРД тав. САЛАУЕВА

ЛЁЗНА, 13 жніўня. Ільнацерабільшчык Добрамыслянскай МТС т. Салаўёў ужо выцерабіў 120 гектараў ільну. Якасць яго работы добрая. Спаборнічаючы на права ўдзелу ва ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, Салаўёў днямі ўстанавіў новы рэкорд. За дзень ён выцерабіў 13,5 гектара ільну.

Перавыканалі план ільнацерабленння ільнацерабільшчыкі Лёзнянскай МТС Дзержаўцаў і Шашкоў.

Паспяхова завяршыла перабленне, абмалот і расспід ільну звяно Шэндзелевай з калгаса «Прагрэс». Калгаснікі мяркуюць са свайго ўчастка ў 7 гектараў атрымаць па 8 цэнтнераў ільнавалакна з гектара.

БЕЛТА.

ПЕРШЫЯ КВІТЫ ЗА ЗДАЧУ ЛЬНАВАЛАКНА

Калгасы імя Максіма Горкага і «Молат», Шклоўскага раёна, першымі атрымалі квіты за здачу ільнавалакна новага ўраджаю ў лік выканання кантрактацыйных дагавораў.

Калгас «Молат», Славенскага сельсавета, 3 жніўня здаў 30 кілограмаў ільнавалакна нумарамі 15, 11 і 10. Калгас імя Максіма Горкага, З.-Шклоўскага сельсавета, 8 жніўня здаў 64 кілограмы ільнавалакна нумарамі 15—12.

В. КАВАЛЬЧУК.

ДЗІЎНЫЯ ПАВОДЗІНЫ ПАРТКОМА НАРКОМАСВЕТЫ

Выкрыццё заклятых ворагаў народа ў Наркомасветы абавязвала партыйную арганізацыю Наркомасветы і яе сакратара Васільеву завастрыць сваю пільнасць, мабілізаваць работнікаў апарата наркамата і па-большэвіцку ўзяцца за рашучую ліквідацыю вынікаў шкодніцтва.

Трэба сказаць, што партком Наркомасветы не зрабіў ніякіх урокаў з усіх гэтых падзей. Больш таго, можна прывесці цэлы рад фактаў незвычайна клапатлівых адносін да стаўленікаў і памочнікаў па шкодніцкай дзейнасці подлых ворагаў у самым апараце Наркомасветы. Сакратар парткома тав. Васільева мела больш чым дастаткова матэрыялаў аб контрраволюцыйнай дзейнасці шпіёнаў, засеўшых у наркамаце. Аднак гэтыя сігналы не расследаваліся.

Радавыя работнікі Наркомасветы не раз уздымалі пытанне аб Кузняцовай. А ў Наркомасветы гэтых сігналаў «не прыкмячалі». Зараз менскі гарадскі аддзел народнай асветы ўзначальвае Захарэвіч — бліжэйшая памочніца Кузняцовай. У 1935 годзе Захарэвіч была дырэктарам 32-й менскай школы, дзе тады была выяўлена вялікая колькасць нацыяналістскай і трацкісцкай літаратуры. Аднак, Кузняцова пры дапамозе ворагаў народу, сядзеўшых у Наркомасветы, не толькі пакрыла шкодніцкія справы Захарэвіч, але і вылучыла яе ў свае намесніцы. Парткому Наркомасветы вельмі добра вядома, што Захарэвіч разам з Кузняцовай праваліла работу гарадскога аддзела народнай асветы, што яна не карыстаецца ніякім аўтарытэтам у менскага настаўніцтва. Аднак, Захарэвіч прадаўжае «кіразаць» гарана, а нам, Наркомасветы Серафімаў і партком Наркомасветы спакойна на гэта глядзяць.

У 3-й барысаўскай школе ўсё яшчэ працуе дырэктарам стаўленік выкрытых ворагаў, выкрыты і выкінуты з партыі былы актыўны эсэр Брыгневіч. «Кіраўнікі Барысаўскага райана, стаўленікі ворагаў — Слуцкі і Мышленнік — лепшымі настаўнікамі горада і раёна чамусьці лічаць яўнае не нашых людзей. Так, лепшымі педагогамі ў райана яны лічылі людзей, варожых совецкаму ладу — Вабішчэвіча і Цехановіча, затое да сапраўды совецкіх настаўнікаў у раёне былі самыя хамскія адносіны. Асабліва грубай была з настаўнікамі Мышленнік. Зараз высвятляецца, што Слуцкі і Мышленнік у свой час прыехалі ў БССР з фашысцкай Польшчы, абодва карысталіся незвычайнымі клопатамі ў ворагаў, сядзеўшых у Наркомасветы. Мышленнік за адзін год атрымала ва ўзнагароду «за добрую работу» і грашовую прэмію і пуцёўку на курорт. Усё гэта не можа быць невядома парткому Наркомасветы — член-жа парткома Наромчык да апошняга часу быў памочнікам наркома па кіруючых кадрах.

З 17 чэрвеня ў Наркомасветы валяецца сігнал настаўнікаў клімавіцкай яўрэйскай НСШ пра дырэктара Чорнага, які засмеціў школьную бібліятэку самай махровай контрраволюцыйнай літаратурай, і частку яе скрываў да апошняга часу. Аднак гэты сігнал настаўнікаў ляжыць без усякага рэагавання.

Дашкольныя ўстановы Беларусі падвычайна засмечаны класава-варожымі элементамі. Па нейкай «выпадковасці», жонкам выкрытых ворагаў народа Наркомасветы дае працу выхавальніцамі дзіцячых садоў. Дазволі ўказаць, што толькі ў менскіх дзіцячых садах працуе не мала такіх «выхавальніц». Не выпадкова ў дзіцячым садзе № 42 дзеці распяваюць песеньку «Подайте христа ради». Аказваецца, загадчыца дзіцячым садам Салавейчык гэту песеньку найгрывае дзецям на патэфоне. Пры праверцы ў яе выявілі да 80 старых грамафонных пласцінак з ідэалагічна шкодным зместам.

Калі-ж адзін з бацькоў, член партыі т. Балотнікаў прыйшоў да загадчыка менгарана Захарэвіч расказаць аб гэтым, то яна не захацела з ім гаварыць. Аб гэтых фактах вельмі добра ведае сакратар парткома (яна-ж і начальнік дашкольнага кіраўніцтва) Васільева, але відаць не ў карысць ёй гэта ўскрываць.

Ці выпадкова ўсё гэта? Не, не выпадкова. Працуючы разам з манёрымі шпіёнамі, Васільева ні разу не палняла голасу супроць гэтых мярзотнікаў. Больш таго, 25 красавіка на профсаюзным сходзе работнікаў Наркомасветы, калі контрраволюцыйны твар шпіёнаў і іх саўдзельнікаў ужо быў дастаткова ясны, Васільева выступае па сутнасці ў абарону гэтых ворагаў. Яна заявіла літаральна наступнае:

— Мы на нашым партыйным сходзе крытыкавалі работу, галоўным чынам, наркома і яго намесніка, але недастаткова гаварылі аб сваіх недахопах. На вашым (!?) сходзе гэта трэба ўлічыць...

Так сакратар парткома «мабілізавала» беспартыйных работнікаў наркамата на ўскрыццё шкодніцкіх спраў. Сваім яўна антыпартыйным выступленнем Васільева адводзіла крытыку ад ворагаў народа ў Наркомасветы. Калі ў «Звязде» з'явіўся артыкул «Яшчэ раз аб справах Наркомасветы», Васільева на пытанне радавых работнікаў мела нахабнасць заяўляць: «Абвінавачанне Варончанка недастаткова сур'ёзнае, ён, моў, вырас у нас на вачах»...

«Звязда» восенню мінулага года сігналізавала партыйнай арганізацыі Наркомасветы аб тым, што Васільева, працуючы сакратаром Чэрвеньскага РК КП(б)Б, на агульнараённым партыйным сходзе выступіла з ярай абаронай аднаго трацкіста. Ёсць яшчэ рад момантаў у біяграфіі Васільевай, якія павінны сур'ёзна зацікавіць партыйную арганізацыю Наркомасветы.

Два словы аб парткоме. Ён складаецца з Васільевай і бліжэйшага памочніка ворагаў па расстаноўцы кадраў на мясцах — Паромчыка. Гэтага Паромчыка вораг у свой час перацягнуў да сябе ў аддзел ЦК КП(б)Б, а затым у Наркомасветы.

Не выпадкова падазроная дзейнасць і намесніка наркома асветы Серафімава. Ён у свой час працаваў у менскім экране, дасканала ўжываўся з ліквідамі беларускіх нацыяналістаў і польскімі шпіёнамі. Быў з імі ў незвычайна цёплых адносінах. Не выпадкова адзін шпіён і правакатар (у 1930—31 г.) перацягнуў Серафімава ў Акадэмію навук і вылучыў старшынёй ЦБ краязнаўства. Гэта ЦБ краязнаўства прапаведвала контрраволюцыйныя нацыяналістскія «тэорыі» «самабытнага» развіцця беларускай эканомікі і культуры, вяло шкодніцкую лінію на адрыў беларускага народа ад брацкай рускай вялікай пролетарскай культуры. Разам са злейшымі ворагамі народа Серафімаў радагаваў часопіс ЦБ краязнаўства «Совецкая краіна». У гэтым часопісе падвізаліся беларускія нацыянал-фашысты і інш. контрраволюцыйныя поскудзь.

Не выпадкова 10 жніўня на профсаюзным сходзе работнікаў наркамата, скліканым для абмеркавання артыкула ў газеце «Звязда» — «Яшчэ раз аб справах Наркомасветы». Серафімаў выступіў з дакладам, у якім нічога па сутнасці артыкула не сказаў. Ні слозам не абмовіўся аб тым, што робіць і рабіў ён па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва. А як відома, не гледзячы на сігнал «Звязды», у багушэвіцкую школу Бярэзінскага раёна ніхто так і не выехаў. На падрабязнай дакладной запісцы дырэктара Аршанскага настаўніцкага інстытута, патрабуючага канкрэтнай дапамогі Наркомасветы па раду пытанняў, Серафімаў кладзе рэзалюцыю: «Смірноў. Ёсць загал. Пазвані Левіну (дырэктару), што ў яго, чым яму трэба дапамагчы». Ніякага загаду аб дапамозе гэтаму інстытуту мы ў справах Наркомасветы не знайшлі. Нельга выявіць і ніякай дапамогі. Усё ідзе па-старому.

Такім чынам, станозішча спраў патрабуе неадкладна прыглядзецца да палітычнага твару Серафімава, Васільевай і Паромчыка. Кагановіцкі РК КП(б)Б павінен неадкладна змяніць свае адносіны да партыйнага камітэта Наркомасветы, паводзіны якога вельмі дзіўныя.

В. З.

ВЫКАРЧОЎВАЦЬ ПОЛЬСКІХ ШПІЁНАЎ

(Пісьмо з Слуцка)

Польскія шпіёны, дыверсанты і забойцы, пралезшыя ў партыйныя, совецкія і земельныя органы Слуцкай пагранічнай акругі, доўгі час нагла тварылі свае шкодніцкія контрраволюцыйныя справы. Яны прыкладалі свае брудныя лапы да сельскай гаспадаркі акругі.

З захапленнем выконваючы шкодніцкія «дырэктывы» ворагаў, заг. акрза Караліёў, акруговы агранам Малочка наўмысна пазбавілі 24.242 калгасныя гаспадаркі мінімальнай нормы прысядзібных участкаў. Шкоднікі апрэкінулі сталінскі статут сельгасарцелі. Яны раілі калгаснікам даводзіць сваю сядзібу да поўнай нормы шляхам балотных і лядных раскарчовак. Ашуканчым, жульніцкім металам у часе ўручэння калгасам актаў на вечнае карыстанне зямлёй акрза пазбаўляе неабходнай нормы сядзіб 242 калгасныя гаспадаркі арцелі «Чырвоны вартавы», Капыльскага раёна, 144 гаспадаркі арцелі «Іскра», Слуцкага раёна. Такая шкодніцкая практыка праводзілася ў многіх іншых калгасах акругі.

Ад калгаснікаў паступалі шматлікія сігналы ў акругком партыі, акрвыканком і акруговы земельны аддзел аб грубейшых парушэннях статута сельгасарцелі. Аднак, сігналы марынавалі, да голасу прапоўных не прыслухоўваліся.

Польскія шпіёны з Наркамзема прыязджалі ў Слуцкую акругу, наведвалі пагранічныя раёны. Трацкісцкія бандыты прыязджалі сюды распаўсюджваць анемію, каб вывесці са строю коней, а загадчыка акрза Караліёў і аграном Малочка, зетурачы Рыжманаў і Белы безагаворачна праводзілі шкодніцкія ўстаноўкі ворагаў народу.

Хворыя анеміяй коні не былі поўнасцю ізаляваны ў 1936 г. і пакінуты ў калгасах на 1937 год, каб зноў распаўсюдзіць заразу па ўсёй акрузе. Вынікі гэтага шкодніцтва далёка не ліквідаваны і цяпер.

Польскія шпіёны па-шкодніцку насаджалі соўгасы на калгасных землях.

Шкоднікі з акрза пазбавілі зямлі большасць гаспадарак аднаасобнікаў акругі. У Любаньскім раёне 69 аднаасобных гаспадарак вёскі Цесава асталіся зусім без зямлі. Гэта Караліёў і Малочка выконвалі контрраволюцыйныя ўстаноўкі польскіх шпіёнаў. Сотні аднаасобнікаў абівалі парогі акрза і райза. Яны законна патрабавалі надзяліць іх зямлёй і сенажаццю. Аднак без карысці.

Сзаволле над калгаснікамі набывала нечуваныя размеры. Калгаснікамі камандавалі, незаконна штрафавалі. Так, дырэктар Слуцкай МТС тав. Куксёнак у 1936 годзе аштрафаваў калгас «Шляхі калектывізацыі» на 170 руб. за прастой малатарні, якая была дрэнна адрамантавана ў майстэрні, той-жа Слуцкай МТС.

Уборка па акрузе праходзіць далёка незадавальняюча. Наглядаюцца вялікія прастоі трактараў, частыя і абураючыя «непаладкі» з камбайнамі, малатарнямі і іншымі ўборачнымі сельскагаспадарчымі машынамі. Усё гэта паказвае, што шкоднікаў да канца не разграмілі і зараз.

Аб усіх пералічаных фактах наглай дзейнасці ворагаў народу добра ведаў загадчык сельскагаспадарчага аддзела акруткома партыі Бабак. Аднак мер ён не прыняў. Наадварот, да апошніх дзён ён патураў шкодніцтву польскіх шпіёнаў. Партыйнасць Бабака выклікае сумненні. Бабак карыстаўся асобай павагай у выкрытых ворагаў народу, польскіх шпіёнаў, якія арудвалі ў акругкоме і акрвыканкоме. Таксама не высветлены поўнасцю яго пазіцыі ў 1929 годзе, калі ён вучыўся ў Горках, дзе ў гэты час арудавалі нацыянал-фашысты. Бабак скрыў ад партыі, што дзядзька яго да рэвалюцыі служыў наглядальнікам Слуцкай турмы.

Акругком партыі толькі пядаўна адхіліў ад работы загадчыка акрза Караліёва і загадчыка сельскагаспадарчага аддзела Бабака. Гэтым ён абмежаваўся. Апарат земельных органаў так і не праверан, не ачышчан ад варожых элементаў.

Поплая банда польскіх шпіёнаў, каб выклікаць незадавальненне калгаснікаў і аднаасобнікаў, правозіла шкодніцтва ў падатковай палітыцы.

Акруговы фінансавы аддзел далёка апярэдзіў у сэаіх незаконных дзеяннях лепельскіх шкоднікаў. Загадчык акрфа Валіцкі быў увесь час на асобым рахунку ў шкоднікаў з Наркамфіна, якія наведвалі Слуцк і знаёміліся з работай акругавага фінаддзела. Валіцкі, яшчэ працуючы загадчыкам слуцкага раённага фінансавага аддзела, пераабкладаў падаткам сялянскія гаспадаркі, рабіў незаконныя забранні рэчаў хатняга ўжытку. Калі Валіцкі пачаў узначальнаць акрфа, па акрузе было пераабкладзена 1.251 гаспадарка аднаасобнікаў. Незаконыя штрафы, забранні маемасці ператварыліся ў сістэму работы фінансавых органаў акругі.

Валіцкі поўнасцю апраўдаў давер'е шкоднікаў. Акрвыканком і акрфа інструктавалі старшынь сельсоветаў забіраць гумны, коней, свіней, хлявы, сукно, шафы і інш. рэчы хатняга ўжытку. У Серадніковскім сельсавеце, Слуцкага раёна, былы старшыня Кіявіцкі да апошніх дзён працягваў незаконнае забранне маемасці, прысвойваў забраныя грошы, незаконна браў у калгасах прадукты. Шкодніцтва Валіцкім не выпраўлена. І сёння не закончан зварот незаконна забранай маемасці ў 100 сялянскіх гаспадарак. Дарэмна ходзяць сяляне ў акрвыканком, акрфа з законнымі скаргамі.

Акруговы камітэт партыі па-сямейнаму адносіўся да абураючых фактаў парушэння палатковай палітыкі совецкай улады. Галоўныя натхнімелі перагібаў з акрфа асталіся некранутымі.

Дзіўную лінію займае акругком партыі і зараз. Назат пасля выкрыцця зграі польскіх шпіёнаў у акрузе адчуваецца спакой.

Акругком партыі павінен мабілізаваць партыйную арганізацыю і прапоўных акругі на ліквідацыю вынікаў шкодніцтва, на выкрыццё ўсіх фашысцкіх шпіёнаў і іх стаўленнікаў.

М. АСТАПЕНКА.

АКАЗЁНІЛІ ПАЛІТАГІТАЦЫЮ

Палітагітацыя сярод служачых, працуючых у Доме ўрада, праводзіцца казённа-фармальна. Усе заняткі звычайна праходзяць у выглядзе чытання газет або іншых матэрыялаў пасля сканчэння работы. Аднак на гэтых занятках пэлы рад работнікаў не прысутнічае: адны не прыходзяць таму, што да трох з палозай гадзін не спраўляюцца адпусціць усіх наведвальнікаў, а другія не наведваюць заняткаў таму, што яны іх не задавальваюць, бо няма дыферэнцыяванага падыходу да складання груп. Больш падрыхтаваным таварышам сумна на занятках, а менш падрыхтаваным — многае незразумела.

Траба адзначыць, што такія формы масавай палітагітацыі, як палітгі, вечары пытанняў і адказаў, зусім адсутнічаюць. Вельмі важны ўчастак работы — палітычнае выхаванне жонак служачых. Аднак у нас сярод гэтай групы прапоўных зусім не праводзіцца ніякай масавай работы. Лічу, што аддзелам прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б і Менскага гаркома трэба склікаць нараду для абмену вопытам палітагітацыі сярод служачых.

Прапагандыст МАЛІНКОВІЧ.

У доме адпачынку «Блонь», Барысаўскага раёна. НА ЗДЫМКУ: група адпачываючых настаўнікаў: Панкоў А. К. — Круглянскі раён, Рашэўская Л. І. — Барысаўскі раён, Пасмурцова В. П. — Менскі раён, Світкоўская М. Ц. — Крупскі раён, Радзэўскі І. П. — Круглянскі раён, Хвалько Л. Н. — Менскі раён.

Фото Лупейко (БСФ).

БЯСКЛОПАТНАСЦЬ У ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА

Падрыхтоўка да новага навучальнага года ў Кармянскім раёне пад пагрозай зрыву. Факты сведчаць аб тым, што гэтай вельмі адказнай работай ніхто не кіруе і не займаецца.

Раённы аддзел народнай асветы і яго загадчык Прудзікаў дагэтуль не правялі ні аднаго мерапрыемства па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў сістэме народнай асветы і, як-бы нічога не было, спакойна адседжваюцца.

Рамонт школ у раёне праходзіць зусім незадавальняюча. Амаль усе школы Расохскага сельсавета патрабуюць бягучага рамонту, але з прычыны бясклопатнасці дырэктароў, загадчыкаў школ і райана рэмонт не распачаты. Памяшканне Расохскай школы, напрыклад, скарыстоўваецца настаўніцай Гусаровіч для малацьбы збожжа.

Рамонт карацькоўскай школы з-за адсутнасці сродкаў прыпынен. Дырэктар школы аб гэтым сігналізаваў райана, але дапамогі ніякай не аказана.

З рук вон дрэнна рыхтуюцца да навучальнага года і ў школах Руднянскага сельсавета. Рамонт школ тут зрываецца, а ёсць школы, у якіх не правёўшы рамонту займацца нельга. Да ліку такіх адносяцца лабуроўская і кабыліцкая школы.

У многіх школах адсутнічае належная колькасць парт. Так, у руднянскай школе, напрыклад, на адну парту прыпадае па восем вучняў.

Многія школы раёна засмечаны варожымі, неісьменнымі і выпадковымі людзьмі. Па ачыстцы школ ад такіх людзей нічога не робіцца. Больш таго, загадчык райана Прудзікаў узяў многіх пад абарону, прыкрывае ўсякімі манерамі іх варожую работу.

Доўгі час Прудзікаў прыкрываў яўна разлажыўшагася контрраволюцыйнага элемента, стаўленіка ворагаў — Збарамірскага. Апошні не толькі займаўся контрраволюцыйнай агітацыяй, але і практычна ажыццяўляў шкодніцтва. У мінулую восень ён некалькі начэй разбіраў фундамент школы і пэглу перавозіў сваім сваякам — сектантам. Зараз школа патрабуе вялікага рамонту, ёй пагражае разбурэнне.

Аб усім гэтым Прудзікаў ведаў, але мер не прымаў. Ён ўсяк абараняў Збарамірскага, прыкрываў яго варожую работу.

Добрымі прыяцелямі Прудзікава былі вядомы прахадзімец Ладошкін і трацкісцкі шчанюк Камандзенка.

Не без ведама Прудзікава ў струменьскай школе нейкі Баханькоў ідэалізаваў Плеханава, называючы яго сапраўдным марксістам. На пасадзе дырэктара гэтай школы знаходзіцца сын кулака Сяргеенка, які на гэту работу папаў выпадкова.

Бычанская школа таксама засмечана непалезнымі элементамі. Тут яшчэ знаходзяць месца прыхільнікі трацкісцкага выродка Камандзенкі, Рыжанкоў, Клімянкоў і іншыя. Не менш трывожнае становішча в падборам настаўнікаў і ў струкачоўскай школе. Тут таксама працуюць непадзейныя людзі, і не выпадкова, што вучні гэтай школы папалі пад уплыў сектантаў.

Калі прыпомніць тое, што ў свой час адзін шпіён і закляты вораг характарызаваў Прудзікава як лепшага і ставіў пытанне аб прэміраванні яго, то робіцца амаль ясным, чаму правальзаецца падрыхтоўка да навучальнага года і не вядзецца барацьбы за ліквідацыю вынікаў шкодніцтва.

Зусім незразумела бясклопатнасць райкома партыі ў падрыхтоўцы да новага навучальнага года.

І. Ц.

ШКОЛАЮ КІРУЕ П'ЯНІЦА І БЕЗГАСПАДАРНІК

Нельга ніяк мірыцца са злачынствамі, што творацца ў сёмай пачатковай школе г. Н. Барысава. Загадчык гэтай школы Ламака, замест падрыхтоўкі да новага навучальнага года, кожны дзень п'янствуе і дыскрэдытуе гэтым ганаровае імя совецкага настаўніка ў вачах насельніцтва.

У школе ўсё разламана, прыведзена да поўнай безгаспадарчасці. Але Ламака і не думае прыступіць да рамонту. Больш таго, ён проста па-шкодніцку адносіцца да маёмасці школы. У школьнае памяшканне ён упусціў невядомых кватарантаў і дазволіў ім нават школьнымі дровамі паліць печы. Калі тэхнічная працаўніца дровы замкнула, то кватаранты пачалі рэзаць і паліць скамейкі.

Ламака наогул школай не цікавіцца. Зараз ужо прыходзяць з заявамі аб прыёме ў школу, але пагутарыць няма з кім. Нават заявы няма каму пакінуць.

Як мірыцца з гэтым становішчам? Ці не лепш было-б ачысціць школу ад п'яніцы і злачынніка Ламакі? **ШАРКОЎСКАЯ.**

У Лёзне не прыслухоўваюцца да скарг працоўных

Я некалькі разоў пісаў у лёзнянскую газету «Ленінскі сцяг» аб тым, што загадчыца Дома калгасніка м. Лёзны Хоцімчанка сваім «кіраўніцтвам» давяла дом да агіднага становішча, і зволіла прапаўніцу Кулакову, якая выкрывала агіднасці, беспакарана тварымыя Хоцімчанка.

Местсовет Лёзны пастановай ад 14 сакавіка 1937 г. зняў Хоцімчанка з працы, але яна знайшла ў асобе сакратара РВК Новікава і былога старшыні Нэймана абаронцаў, якія лабіліся яе аднаўлення.

Гэта справа была перадана пракуратуры БССР. Пракуратура накіравала справу ў лёзнянскі РВК, дзе ўжо працуе старшынёй Шапураў.

Аднак Шапураў аказаўся вартым сваіх папярэднікаў. Калі я звярнуўся ў рэдакцыю газеты «Ленінскі сцяг» і запытаўся аб лёсе майго матэрыяла аб Хоцімчанка, то рэдактар газеты т. Мінчукоў мне адказаў: «Усе пісьмы перададзены ў РВК, прэзідыум якога будзе разбіраць. Пажадана, каб і ты быў на прэзідыуме». Я пашоў у РВК якраз было пасяджэнне. Калі я расказаў старшыні прэзідыума Шапураву чаго прышоў, ён мяне прагнаў.

Такія адносіны кіраўнікоў раёна да скарг працоўных невышадковыя. Аказваецца, што Хоцімчанка з'яўляецца жонкай інструктара райкома КП(б)Б, таму яны так абараняюць яе і прымушаюць у нічым не вінаватую працаўніцу Кулакову хадзіць без працы.

КІРЭЕЎ.

Жулікі арудуюць беспакарана

На курынскім маслазаводзе (Суражскі раён) некаторыя работнікі перасталі адрозніваць, дзе дзяржаўнае дабро, а дзе сваё. Яны сістэматычна і беспакарана раскрадваюць масла, малако, абшукваюць малаказдатчыкаў, зніжаюць ім процант тлустасці і т. д. Вось, напрыклад, старшы масларобы Усаў Н. прысвоіў 112 кілограмаў масла і растраціў 700 руб. грошай. Работніца Квіткоўская не толькі сама раскрадвае малако і масла, а замятае сляды іншых злачынцаў. Нядаўна ўкрала з завода бідон з 36 літрамі сліваК. Каб утаіць сляды злачынства, Квіткоўская запоўніла бідон абратам (перагоннае малако).

Кралае беспакарана і работнік маслазавода Аўтухоў і многія іншыя.

Ёсць нямала фактаў, калі абрат выдаецца за хабар «сваім» людзям, якія нават малака не здаюць. Прыкладным-жа малаказдатчыкам, якім абрат павінен выдавацца ў першую чаргу, зусім не выдаюць.

Аб усіх гэтых злачынствах пісалі не раз у суражскую раённую газету. Стала быць, не маглі не ведаць і кіраўнікі раённых арганізацый. Аднак невядома толькі, чаму мер не прымалі. Не палічыў сваім абавязкам адгукнуцца на сігналы калгаснікаў і райпракурор, які заклікан ахоўваць совецкія законы. **Е. КЛІМОВІЧ.**

Злачынніка—пад суд

(Пісьмо калгасніка)

Трактарыст Шабуня Юзік (які працуе ў Белбудлеспромтрэсце па вывазцы лесу ў калгасе «Чырвоны араты», Пагоскага сельсавета, Бярэзінскага раёна) 11 чэрвеня г.г. заязджаў трактарам маю 13-гадовую дачку Несцяровіч Машу. Праязджаючы па вёсцы ён дазволіў дзецям салзіцца на задні прычэп трактара, гаворачы ім: «прынясіце мне яблык і яек, а я вас буду заўсёды вазіць за два кілометры».

На гэты раз п'яны Шабуня праязджаючы па нашай вёсцы, без грузу дазволіў дзецям салзіцца на-ходу на задні прычэп, змяншаючы пры гэтым хуткасць руху трактара адрывістымі штуршкамі. У гэты час мая дачка ўпала і на месцы была зарэзана заднім калясом прычэпа трактара. Заўважыўшы гэта, людзі закрычалі: «Спыніся трактарыст, ты-ж зарэзаў дзяўчынку». Ён не спыніўся і быстра паехаў.

Райміліцыяй гэта справа была расследавана і аформлена для перадачы ў суд. Але-ж начальнік бярэзінскай міліцыі чамусьці яе спыніў. Калі я звярнуўся да начальніка міліцыі з запытаннем: чаму не перадаецце справу ў суд? ён адказаў: «Гэта справа не патрабуе судовага разбору, трактарыст у гэтым не вінават, няхай дзіця не лезе куды не трэба», і пры тым дадаў: «Аслабаніце кабінет, я з вам! больш не разгаварваю».

Райпракурор прыняць ад мяне заяву зусім адмовіўся, адказаўшы, што не знаходзіць патрэбы прыцягваць Шабуню да крымінальнай адказнасці і адлаваць яго пад суд. Далей ён растлумачыў так: «Я пераўся з начальнікам міліцыі, і мы прышлі да вывалу—спыніць справу, бо Шабуня зусім не вінаваты». Гэты злачынца і па сёння астаецца непакараным.

Нікалай НЕСЦЯРОВІЧ.

ГОМЕЛЬСКІ ЗАВОД імя КІРАВА НЕ ЗМАГАЕЦЦА ЗА ЯКАСЦЬ ПРАДУКЦЫІ

Гомельскі машынабудаўнічы завод імя Кірава выпускае даўбёжныя, стругальныя і іншыя складанейшыя станкі, патрэбныя нашай прамысловасці. Якасць выпускаемай заводам прадукцыі—адно з важнейшых пытанняў сёнешняга дня. Між тым, завод яшчэ далёка не наладзіў кантролю за якасцю.

У зборачным цэху раней працавалі 2 работнікі аддзела тэхнічнага кантролю: прыёмшчык асобных дэталей і кантрольны майстар. Праз іх рукі праходзіла маса дэталей і ўзлоў машын, якія пазнны былі паступаць у зборку. Пры малейшым недагляде з боку прыёмшчыка ў зборку лёгка могуць трапіць дэфектныя часткі машын, і талы яны могуць быць выяўлены толькі пры канчатковай прыёмцы станка, што прыводзіць да затрымання выпуску прадукцыі і павышае яе сабекошт.

Але дырэктар завода т. Валодзька замест узмацнення кантролю, зволіў прыёмшчыка-кантралёра дэталей. Гэта прывяло да павышэння дэфектнасці гатовай прадукцыі. Замест нармальных 3—5 дэфектаў на станок, іх колькасць вырасла да 30—35, што выклікае затраты не малай колькасці грошай на перапрацоўку. Становішча ўскугубляецца тым, што кантрольных інструментаў нехапае, а наяўныя маюць шмат дэфектаў ад зносу і даўно не правяраліся.

Дырэктар т. Валодзька на пасаду дыспетчара завода прыняў свайго знаёмага Ласціна і плоціць яму штомесячна па 550 руб., у той час, як раней гэту работу выконваў планавік, атрымоўваючы 250 руб. Але справа не ў грошах, а ў тым, што гэты Ласцін абсалютна нічога не разумее ў машынабудаўнічай вытворчасці і ніякай карысці заводу як дыспетчар не прыносіць. І усё-ж не гледзячы на гэта т. Валодзька ўсімі мерамі стараўся ўтрымаць яго наперакор патрабаванням партарганізацыі і ўсёй грамадскасці завода аб знятці Ласціна.

ВОКА.

***

ГОМЕЛЬ. (Кар. «Звязды»). Прыведзеныя факты пры праверцы пацвердзіліся. Практыка работы т. Валодзька спрыяе парушэнню заводам тэхнічных умоў выпуску прадукцыі. Знаходзячыся на заводзе інспектар галоўнага кіраўніцтва станка-інструментальнай прамысловасці Іонычаў штодзенна піша напамінкі кіраўніцтву завода аб гэтым, але яго запіскі ў большасці астаюцца без рэагавання.

Выпускаемая заводам прадукцыя часта дасылаецца спажыўцам некамплектна. Так, у чэрвені завод зняў з адпраўляемых спажыўцам станкоў 7 матораў. Прычым, па ініцыятыве т. Валодзька завод патрабуе ад спажыўцоў пісьмовай згоды на дасылку некамплектных станкоў. Зразумела, што такія пісулькі не могуць апраўдаць антыдзяржаўнай практыкі выпуску некамплектнай прадукцыі.

Сабекошт прадукцыі вельмі высокі. Так, каштоўнасць насоса В-2 перавышае планавую на 88 руб., В-3—на 101 руб., В-4—на 397 руб. Каштоўнасць даўбёжнага станка перавышае планавую на 710 руб., а па шэпінгах перавышэнне дасягае 2.234 руб. Прыведзеныя лічбы з'яўляюцца сярэднімі за паўгода і, як кажуць, «каментарый не патрабуюць».

Работа на заводзе арганізавана так, што большасць прадукцыі выпускаецца к канцу месяца. Гэта стварае незадаволную штурмаўшчыну. Больш таго, гэта выклікае павелічэнне сабекошту, бо для аднасвовага выпуску 7—10 станкоў патрэбна пабудова адпаведных фундаментаў, без якіх немагчыма іх апрабаванне. Між тым ёсць усе магчымасці наладзіць серыйны выпуск станкоў некалькі разоў у месяц. Але т. Валодзька чамусьці ўпарта адстойвае школьную тэорыю выпуску прадукцыі разам, адначасова, не гледзячы на ўсю яе неабгрунтаванасць.

Сістэма т. Валодзькі прыводзіць да зрыву выканання плана выпуску машын. У выніку, за паўгоддзе завод недалаў дзяржаве 13 шэпінгаў, што ў пераводзе на грошы складае больш 220 тысяч рублёў. Школьнасць існуючай на заводзе практыкі работы відавочна. Але кіраўніцтва Белмаштанкатрэста чамусьці іх не прымячае.

І. КАРАЛЬКОЎ.

СІЛА ПРЫКЛАДУ

Выпадак, аб якім будзе расказана крыху ніжэй, адбыўся не так даўно ў калгасах «Камінтэрн» і «Шлях да комуны», Будакашалёўскага раёна. Доўгі час малодога калгасніка Міцькоўскага Максіма з калгаса «Камінтэрн» ведалі тут, у навакольных калгасах, як упартага, непаслухмянага свавольніка. І размовы пра яго ішлі такія.

— Прапашчы чалавек...

— У хлопца сілы шмат, але не ведае, дзе яе прыкласці, вось і буяніць.

З гэтым звыкліся, і ніхто інакш не мог уявіць сабе Максіма, як толькі такім граміламі. Так гаварылі пра Максіма год, два... пяць... і, нарэшце, як пачалі касіць гэтым летам сенажаць. Максім зноў нарабіў шуму на палы калгас. На сенажаці ён пачаў «надразаць пяты» сваім напарнікам: з ім ніхто не мог спаборнічаць, ён заўсёды быў наперадзе.

— Няўжо, хлопец за розум ўзяўся? — нясмела перагаварваліся калгаснікі.

А Максім сапраўды цвёрда рашыў назаўсёды пакончыць з мінуўшчынай і прагрымець на ўсю рэспубліку, толькі не сваім свавольствам, а ўпартаю стаханаўскаю працаю на калгасных палях. Так і атрымалася.

Аднаго разу, праглядаючы газеты, Максім заўважыў невялічкую заметку. Прачытаў. У ёй паведамлялася, што адзін машыніст з Кубані на жнярцы-самаскідцы выжынае за дзень 12 гектараў пшаніцы. «Чаму-б гэта і мне не даць гэтулькі-ж»,— падумаў Максім. Падумаў, і рашыў з пачаткам уборкі абавязкова перакрыць рэкорд кубанскага калгасніка.

Праз некалькі дзён з'явіўся ён у калгасную кузню і паведаміў каваля, што сам адрамантуе сваю жнярку. Машына была разабрана, прачышчана, кожны вінцік быў шчыльна прыгнан, і калі падышоў час уборкі, Максім упэўнена заявіў:

— На гэтай жнярцы я прапрацую ўсю ўборачную без рамонту.

У першыя дні жніва Максіму не ўдавалася перакрыць рэкорд невядомага калгасніка з Кубані. Але, не гледзячы на гэта, ён удвая перакрыў норму, устаноўленую на жнярку-самаскідку, і даказаў калгаснікам, што 4 га ўбіраць на ёп — надзвычай мала.

Думку аб рэкордзе не пакідаў Максім. Рашыў працаваць на зменных конях. Старшыня калгаса Савелій Рыпінскі лаў яму на гэта згоду. На другі дзень, разам з усходам сонца, выехаў Максім на жніво. Густое, рослае жыта пакорліва схілялася на жнярку, і следам за ёю клалася на іржышча роўнымі валкамі. Днём неяк нечакана пайшоў дождж. Больш двух гадзін хвалюючыся, чакаў Максім, пакуль распагодзіцца. Назат сумненні з'явіліся, што не зжаць яму 12 гектараў.

Калі крыху апала дажджавая раса, зноў прыступіў да работы. З кожным заездам усё шырэйшым і шырэйшым рабіўся ўчастак зжатага збожжа. Вечарам абмералі, палічылі, і вышла, што Максім Міцькоўскі добраякасна зжаў 11,71 гектара густога збожжа.

Зноў загаварылі пра Максіма, ды яшчэ як загаварылі! Адны—калгаснікі-комінтэрнаўцы самі схадзілі на поле, пераканаліся, што сапраўды Максім зжаў лезь не 12 гектараў, і зжаў добраякасна, ні аднаго папутанага валка, і гаварылі пра Максіма вельмі захапляюча: «Наш Максім герой...» Другія, як некаторыя калгаснікі з суседняга калгаса «Шлях да комуны», зусім не верылі гэтаму «цуду».

— Жаў чалавек некалькі дзён, — разважалі яны, — а яму залічылі ў адзін дзень, вось і вышаў рэкорд.

А каваль, Архіп Прыходзька, якога ведаюць у навакольных калгасах, як лодыра і бракароба, паважна выходзіць наперад сабраўшыхся калгаснікаў і, стукаючы кулаком у грудзі, аўтарытэтна заяўляе:

— Калгаснікі, у нас вось узве жнярукі працуюць і то ледзь выжынаюць разам 5 гектараў. А тут — 12 на адну. Не можа гэтага быць...

Затым ён абхапіў аберуч сваю касматую галаву і прадаўжаў:

— Што можа быць даражэй чалавеку, як яго ўласная галава...

— Прычым тут твая галава? — пачуліся галасы.

— Дайце дагаварыць чалавеку, — прапанавалі другія. А каваль, яшчэ больш энергічна б'ючы сябе ў грудзі, даказваў:

— Калі ён выжне пры ўсім народзе 12 гектараў, то даю вам сваю галаву на адрэз...

У гарачыя спрэчкі калгаснікаў умяшаўся старшыня калгаса тав. Голухаў. Ён прабаваў даказаць, што сапраўды Максім Міцькоўскі зжаў за адзін дзень 11,71 гектара густога жыта. Калі хто сумняваецца, то няхай сходзіць у калгас «Комінтэрн» і абмерае ўчастак, і разам з гэтым павучыцца ў Максіма, як трэба прапаваць пастаханаўску.

— Я вам аўтарытэтна заяўляю, — не здаваўся Архіп, — што норму на жнярку-самаскідку ў 4 гектары выдумаў не дурны чалавек. Ды і без навукі тут, напэўна, не абышлося, а навука... — і ён многазначна паківаў пальцам.

Як-бы там ні было, але гутаркі і сумненні калгаснікаў з калгаса «Шлях да комуны» хутка дайшлі да комінтэрнаўцаў. Дайшлі яны і да Максіма.

— Не верыць, — хмура прагаварыў Міцькоўскі. — Ладна, паспрабуем даказаць, каб паверылі.

Параіўшыся з старшынёю калгаса Рыпінскім, было вырашана неадкладна выехаць у калгас «Шлях да комуны» і даказаць сваю правату, сваё майстэрства валодаць машынай.

Вечарам 24 ліпеня ў калгасе «Шлях да комуны» быў вызелен участак рослага жыта. А раніцай другога дня «цуда»-жнярка Міцькоўскага з'явілася на палях калгаса. Вестка аб прыездзе ў калгас Міцькоўскага разнеслася па ўсёй вёсцы. На поле, дзе прапаваў Максім, прыходзілі спачатку па аднаму, потым групамі калгаснікі і аднаасобнікі. Некаторыя недаверліва паглядалі на ўкормленых коней, якія шпарка ішлі па іржышчу, на ўпэўненыя рухі малодога машыніста Міцькоўскага.

— Няўжо сажне?—папіскаючы плячыма, казалі яны. — Прапала тады галава Архіпа.

Назвячоркам на поле сабраўся пэлы натоўп. Як кінуць вокам, наўкруг ляжалі роўныя валкі збожжа. Аўтарытэтная камісія абыходзіла зжаты ўчастак з «казой» і дакладна абмярала. Некаторыя недаверкі беглі следам за камісіяй і правяралі крокамі правільнасць абмеру.

— Хто яшчэ не верыць, няхай сам абмерае, — прапаноўваў Рыпінскі. Але такіх ужо не знаходзілася. Усе чакалі вынікаў палічку.

— Трынаццаць з палавінай гектараў,— паведаміла камісія.

Пішыню летняга надвячорка напоўнілі гучны гоман, усклікані ўхвалення, смех і словы здзіўлення.

— От гэта рэкорд...

— Малайзец Максім...

Нехта выкрыкнуў:

— Архіпа вядзіце сюды, галаву будзем рэзаць...

— Не трэба, пярэчылі яму, — Архіпу і так рот заткнулі, што больш брахаць не будзе.

— Не аднаму яму заткнулі, а многім, — дадаў нехта.

...З поля калгаса «Шлях да комуны» Максім Мацвеевіч Міцькоўскі паехаў пераможцам, паехаў з адным жаданнем — у хуткім часе перакрыць і гэты рэкорд.

Праз некалькі дзён машыністы жнярак калгаса «Шлях да комуны», якія ніяк не маглі выканаць устаноўленай нормы, рэзка пачалі іх перавыконваць.

Такая сіла прыкладу.

Н. ВІШНЕЎСКІ.

Калгас «Комінтэрн», Будакашалёўскага раёна.

ПАПЯРЭДЗІЦЬ ЗРЫЎ ЗАБЕСПЯЧЭННЯ МЕНСКА АПАЛАМ

Забеспячэнне апалам прамысловасці, устаноў і насельніцтва сталіцы з'яўляецца пытаннем выключнай важнасці. Усім зразумела, што перабоі ў снабжэнні апалам дазарганізуюць нармальнае жыццё горада.

Паводле самых арыентыровачных падлікаў, галавая патрэбнасць Менска (уключаючы патрэбы школ, больніц, прамысловасці, устаноў і інш.) складае 495 тыс. раўметраў дроў. Запланаваны-ж 300 тыс. Але-ж нават і гэты план не выконваецца. Лесбел (кіраўнік Рэсін) зрывае завоз дроў Менску.

На чэрвень і ліпень было запланавана завезці 4.111 загонаў, а атрымана толькі 2.284, або 55 проц. плана. Тлумачыцца гэта тым, што Лесбел не даў распараджэння леспрамгасам падвозіць дровы да платна чыгунак. Такім чынам, пагрузка была спынена.

Характэрна, што пры такім нікудышнім стане з выкананнем плана завозу дроў Менску Лесбел запланаваў на жнівень усяго толькі 400 вагонаў для Гартопа. Інакш як свядомым зрывам забеспячэння сталіцы апалам гэта нельга назваць.

Аб такім становішчы спраў ведае старшыня горсозета тав. Кузельскі, але мер да паляпшэння ён не прымае. Горсовет не клапоціцца і аб уладжанні справы развозкі дроў прапоўным. У паказе выбаршчыкі патрабавалі ад горсовета арганізаваць развозку аўтатранспартам, але горсовет, відаць, забыўся аб гэтым, хапя ўсе ўмовы для арганізацыі развозкі дроў аўтатранспартам ёсць.

БАСТУН,

дырэктар Менгартопа.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

У раёне на поўдзень ад ракі Тахо мяцежнікі зрабілі атаку каля ракі Альгодор, але былі адкінуты контратакай рэспубліканцаў. Мяцежнікі бамбардыравалі рэспубліканскія пазіцыі каля Талехо. Артылерыя рэспубліканцаў абстрэльвала пазіцыі і грузавікі мяцежнікаў, затрудняючы зносіны ў іх тыле.

УСХОДНІ ФРОНТ

У раёне Тэруэля на ўчастку Беслас мяцежнікі абстрэльвалі пазіцыі рэспубліканцаў.

Рэспубліканскія войскі ажыццявілі разведчую аперацыю прыблізна за адзін кілометр ад вёскі Цанкрудо.

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

На ўчастку Сантандэра абстрэлу мяцежнікаў, падвергліся пазіцыі рэспубліканцаў. Рэспубліканскія батарэі абстрэльвалі скапленні войск мяцежнікаў каля Баруэла.

На астурыйскім участку рэспубліканская артылерыя, падтрыманая авіяцыяй, узмоцнена бамбардыравала Градо і ваколіцы. Мяцежнікі панеслі цяжкія страты. Паводле вестак агенцтва Эспань з Хіхона, па дарозе з Градо пяць рэспубліканскіх знішчальнікаў і пяць бамбардыроўшчыкаў атакавалі скапленні войск мяцежнікаў, абстраляўшы іх з кулямётаў і скінуўшы 30 бомб. Войскі мяцежнікаў пад узмоцненым кулямётным агнём пачалі ўцякаць, пакінуўшы на дарозе збітых і раненых. Бамбардыроўцы падверглася таксама калона непрыяцельскіх грузавікоў; некалькі грузавікоў знішчана.

АБ СТВАРЭННІ АДЗІНАЙ ПАРТЫІ ІСПАНСКАГА ПРОЛЕТАРЫЯТА

ВЫСТУПЛЕННЕ АЛЬВАРЭСА ДЭЛЬ ВАЙО

ВАЛЕНСІЯ, 14 жніўня. (БЕЛТА). На мітынгу, скліканым федэрацыяй Аб'яднанай сацыялістычнай моладзі ў Валенсіі (а не ў Мадрыдзе, як раней паведамлялася) выступіў Альварэс Дэль Вайо. Прысутнічала таксама сустрэтая бурнай авацыяй Даларэс Ібаруры.

Прамова Альварэса дэль Вайо была прысвечана пытанню аб стварэнні адзінай партыі іспанскага пролетарыята. Радавыя члены сацыялістычнай партыі, — сказаў ён, — аднадушна жадаюць адзінства, і таму ні адзін кіраўнік сацыялістычнай партыі не пасмее зараз выступіць адкрыта супроць зліцця сацыялістычнай і камуністычнай партый.

— Толькі адзіная партыя пролетарыята, — падкрэсліў прамоўца, — можа забяспечыць сапраўднае прасоўванне наперад. Зліццё комуністычнай і сацыялістычнай партый можа аблягчыць вырашэнне ваенных праблем. Такім чынам, дзякуючы стварэнню адзінай партыі можа быць паскорана перамога. Міжнароднае становішча Іспаніі загадна патрабуе, каб рады былі згуртаваны. Адзінства партый і за ім адзінства профсаюзных арганізацый нанясуць магутны ўдар ілюзіям фашыстаў і іх саюзнікаў.

Далей Альварэс дэль Вайо заявіў:

Не можа быць іспанца комуніста, сацыяліста, ці анархіста, якія не адчуваюць удзячнасці да Совецкага Саюза. Яго палітыка міру — адзіная прамая палітыка ў свеце. Яна прамая на ўсім працягу гісторыі Совецкага Саюза.

У заключэнне Альварэс дэль Вайо адзначыў, што спыніць зліццё нельга, бо масы правяўць яго незалежна ад пажаданняў тых ці іншых кіраўнікоў. Зліццё стане фактам, і яно будзе сустрэта з радасцю комуністамі і сацыялістамі на фронце і ў тыле.

Удзельнікі мітынга наладзілі Альварэсу дэль Вайо поўную захапленне авацыю.

МЯЦЕЖНІКІ ЗАТАПІЛІ ДАЦКІ ПАРАХОД

ПАРЫЖ, 14 жніўня. (БЕЛТА). З Барселоны паведамляюць, што 12 жніўня чатыры самалёты мяцежнікаў, скінуўшы 25 бомб на дацкі параход «Эдыт» за 30 міль на поўдзень ад Барселоны, затапілі яго. На дапамогу каманде з Вільянуэва і Гельтру выйшлі рыбацкія лодкі. На гэтых лодках 20 чалавек каманды і кантрольны наглядчык (француз), якія знаходзіліся на «Эдыт» дабраліся ўчора раніцай да берагу.

ДЗЕЯННІ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АВІЯЦЫІ

Як паведамляе міністэрства абароны, рэспубліканская авіяцыя абстрэльвала 13 жніўня рад аэрадромаў мяцежнікаў, у тым ліку аэрадром у Бургосе, дзе знаходзілася да 10 самалётаў. Бамбардыроўцы падверглася таксама чыгуначная станцыя ў Сігуэнсе, на якой стаяла 80 вагонаў з ваеннымі матэрыяламі.

***

Як перадае агенцтва Эспань, вечарам 13 жніўня самалёты мяцежнікаў два разы зрабілі налёт на Барселону, але былі адагнаны зенітнай артылерыяй і знішчальнікамі рэспубліканцаў. Гораду не прычынена ніякага ўрону.

ХВАЛЯВАННІ У ВОЙСКАХ МЯЦЕЖНІКАЎ

ПАРЫЖ, 14 жніўня. (БЕЛТА). Спасылаючыся на паведамленне іспанскага міністэрства абароны, Гавас перадае, што ў Сеуце (Іспанскае Марока) 150 салдат 10-га палка афрыканскіх стралкоў былі кінуты мяцежнікамі ў турму за адмаўленне выехаць у Іспанію.

У Эчо, на паўночны захад ад Хака, каля французскай граніцы, два капітаны, адзін лейтэнант і два сяржанты расстраляны ў турме за ўдзел у змове супроць мяцежнікаў.

Антыгітлераўская дэманстрацыя ў Аўстрыі

ВЕНА, 13 жніўня. (БЕЛТА). Як вядома, паміж германскім і аўстрыйскім ураламі заключана пагадненне аб «міры ў друку», згодна якому, паміж іншым, у Аўстрыі быў дазволен продаж кнігі Гітлера «Мая барацьба». Пасля таго, як гэта кніга з'явілася ў вітрынах кніжных магазінаў, учора ў Грацэ (Аўстрыя) адбылася антыгітлераўская дэманстрацыя, якая пратэставала супроць продажу гэтай кнігі ў Аўстрыі. Дэманстранты прымусілі забраць з вітрыны ўсіх кнігарняў кнігу Гітлера. Паліцыя арыштавала некалькі аўстрыйскіх гітлераўцаў.

У Лепель прыбыла каманда шлюпачнага пераходу студэнтаў Ленінградскага інстытута інжынераў воднага транспарта ў колькасці 6 чалавек. Маршрут перахода—Ленінград—Херсон. За 20 хадавых дзён каманда праплыла на сваёй шлюпцы 1.400 кілометраў супроць цячэння па 4 рэках. Да фініша асталося 2300 кілометраў. НА ЗДЫМКУ: удзельніцы пераходу на Лепельскім возеры. Ля руля (справа)—камандор т. Расціславіна.

Фото Пачкаева (БСФ).

ПРЫЗ ГАЗЕТЫ „ЗВЯЗДА" ПА ЛЕГКАЙ АТЛЕТЫЦЫ

На працягу двух дзён 17 і 18 жніўня на Усебеларускім стадыёне будзе ў чацверты раз разыграна гарадское камандное першынства па лёгкай атлетыцы на традыцыйны прыз газеты «Звязда».

Першы раз у 1934 годзе прыз «Звязды» выйграла зборная каманда профсаюзаў горада. У 1935 годзе яго заваявала каманда таварыства «Спартак», а ў мінулым годзе — таварыства «Тэмп».

Сёлета за прыз будуць змагацца 9 каманд буйнейшых фізкультурных таварыстваў горада. Усяго ў спаборніцтвах прымуць удзел каля 300 лепшых бегуноў, прыгуноў і мятальнікаў Менска. Орднаносны тэхнікум фізкультуры выстаўляе найбольшую колькасць удзельнікаў—46 чалавек. За тэхнікум выступаюць таксама рэкардсмены рэспублікі Сокалаў і Гетманец. Мінулагодні пераможца прыза — таварыства «Тэмп» выстаўляе вельмі моцную каманду, у складзе якой — чэмпіёнка рэспублікі Антаніна Міхалькова, рэкардсмены Рапапорт, Ліпніцкі і інш.

У праграме спаборніцтваў 20 розных відаў лёгкай атлетыкі. Каманда-пераможніца атрымае традыцыйны прыз «Звязды», а пераможцы ў кожным відзе будуць узнагароджаны жэтонамі і граматамі.

АДГРУЗКА ЯБЛЫК БУЙНЕЙШЫМ ЦЭНТРАМ

У БССР пачалася адгрузка летніх гатункаў яблык у Маскву, Ленінград, на Далёкі Усход, на Урал. Ужо адгружаны першыя 500 тон.

У сувязі з багатым ураджаем фруктаў загатоўчыя арганізацыі БССР у бягучым годзе вынязуць у розныя пункты Саюза звыш 22 тысяч тон яблык.

ВЫПУСК СПАРТСМЕНАЎ-ПАРАШУТЫСТАЎ

Менскі і гомельскі аэраклубы ў сувязі з падрыхтоўкай да Дня авіяцыі выпусцілі атрады спартсменаў-парашутыстаў, абучаных без адрыву ад вытворчасці.

На масоўках 18 жніўня вучлёты Менска і Гомеля будуць дэманстраваць свае поспехі і паказваць узоры вышэйшага пілатажу.

Па слядах выступленняў „Звязды"

„ШКОДНІКІ У МЕНХАРЧГАНДЛІ"

У артыкуле «Шкоднікі ў Менхарчгандлі», змешчаным у «Звяздзе» 3 жніўня г. г., пісалася аб засмечанасці апарата і сістэмы Менхарчгандля варожымі элементамі, шкоднікамі, якія свядома стваралі перабоі ў забеспячэнні насельніцтва Менска хлебам, газай, каўбасамі вырабамі і інш. прадуктамі. У артыкуле паведамлялася, што дырэктар Менхарчгандля Флеер — былы актыўны бундавец і яго намеснік Герчыкаў акружылі сабе чужымі антысовецкімі элементамі, якія ўзмоцнена ажыццяўлялі іх шкодніцкія распараджэнні і загады.

Спецыяльная камісія Наркамата ўнутранага гандля БССР правяла праверку матэрыялаў, прыведзеных у артыкуле «Звязды». Усе факты поўнасцю пацвердзіліся. 5 жніўня г. г. загадам па Наркамату ўнутранага гандля БССР дырэктар Менхарчгандля Флеер і яго намеснік Герчыкаў адхілены ад работы і справа аб іх перадаецца следчым органам.

За насаджэнне ў апарат антысовецкіх і трацкісцкіх элементаў, за стварэнне перабояў і чаргі ў продажы хлеба, за сувязь і пакрывацельства жулікаў і за рад інш. злачынстваў адхілен ад работы дырэктар хлебэфуражнай базы Менхарчгандля Хейфец. Матэрыялы аб ім таксама перадаюцца следчым органам.

Гэтым-жа загадам знят з работы дырэктар бакалейна-гастранамічнай базы Менхарчгандля Гольдзін за пакрывацельства і сувязь з жулікамі і спекулянтамі і інш. злачынствы.

Партыйная арганізацыя Менхарчгандля выключыла Флеера з радоў КП(б)Б. У бліжэйшы час будзе таксама абмеркавана пытанне аб партыйнасці Герчыкава і сакратара парткома Іофэ.

КІНОФІЛЬМ АБ БЕЛАРУСКІМ ПАЛЕССІ

Кіностудыя «Совецкая Беларусь» выпускае ў бягучым годзе дакументальны кінофільм «Асваенне балот БССР».

Фільм пакажа пяжкае мінулае беларускага Палесся і заможнае, радаснае, культурнае жыццё калгаснікаў, збіраючых на асушаных балотах найбагацейшыя ўраджаі.

Спецыяльная кінобрыгада ўжо закончыла здымкі ў калгасе імя Беларускай ваеннай акругі Любаньскага раёна і пераехала ў соўгас імя 10-годдзя БССР. Гэтыя гаспадаркі, створаныя на калісьці непрахадзімых, а цяпер асвоеных балотах, за гады совецкай улады сталі культурнейшымі куткамі БССР.

АБ ЧАРГОВЫМ НАБОРЫ Ў АСПІРАНТУРУ ІНСТЫТУТА ГІСТОРЫІ ПАРТЫІ

ЦК КП(б)Б прыняў рашэнне па працягу жніўня правесці набор на першы курс аспірантуры Інстытута гісторыі партыі ў колькасці 30 чалавек. Умовы прыёму ў аспірантуру Інстытута гісторыі партыі тыя-ж, што і ў мінулым годзе.

Слухачы аспірантуры забяспечваюцца інтэрнатам і стыпендыяй у памеры 450 рублёў у месяц. Тэрмін навучання трохмесячны.

Аспірантура Інстытута гісторыі партыі рыхтуе выкладчыкаў і навуковых работнікаў па гісторыі партыі.

Заявы аб прыёме падаюцца ў АК, ГК і РК КП(б)Б, а таксама непасрэдна ў Інстытут гісторыі партыі або ў Аддзел партпрапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б.

Заг. Аддзелам партпрапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б ГОТФРЫД.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

Ніжэйпамянёныя ў спісу таварышы выклікаюцца партканферэнцыю пры ўпаўнаважаным КПК пры ЦК ВКП(б) па БССР (г. Менск, Чырвонаармейская, 16, трэці паверх, пакой № 26) на 19 жніўня 1937 года да 11 гадзін дня для разбору іх апеляцыйных спраў: Родава Л. І., Часовкевіч П., Мізевіч К. А., Казлова А. Г., Пачко А. І., Сямёнава Е. В., Кацэвіч П. М., Барсук І. І., Будай К. І., Масевіч В. А. (Менск); Хаданаў Р. Т. (Чэрвень); Васільеў А. В. (Плешчаніцы), Філіповіч М. А., Хамянок А. А. (Добруш), Ефрэмічаў К. І. (Бабруйск); Галаў І. П. (Глуск); Курпяк Х. С. (Журавічы); Разановіч Р. І. (Жыткавічы); Марчаў Е. С. (Мозыр); Ракіта І. К. (Хойнікі); Козінцаў Т. Л. (Ельск).

Парткалегія пры Уп. КПК па БССР.

ЗАЯЎКІ КАЛГАСНІКАЎ

У сувязі з багатым ураджаем калгасы і калгаснікі БССР прад'яўляюць кааперацыйным арганізацыям заяўкі на розднастайны асартымент тавараў, у тым ліку на веласіпеды, патэфоны і іншыя тавары. Белкаапсаюз атрымаў з розных раёнаў дзесяткі заявак.

У раёны БССР ужо завезена для продажу насельніцтву 4.500 веласіпедаў, завозіцца яшчэ 1.500 веласіпедаў. Апрача таго, у бягучым квартале ў сувязі з наближаючымися хлебазакупкамі ў раёны адгружаецца 4 вагоны гатункавага жалеза, 5 вагонаў цвікоў будаўнічых, 1 тысяча велапакрышак, 400 камплектаў аўтапакрышак, значная колькасць абутку, валёнак, ботаў, баваўнянкі, суконна-шарсцяных тавараў, бензіну і т. д.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ МАСТАЦКАЯ САМАДЗЕЙНАСЦЬ

У сувязі з падрыхтоўкай да 20-годдзя вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэволюцыі ў часцях менскага гарнізона пачаліся папярэднія агляды чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці. Выяўляюцца новыя выдатныя народныя таленты. За параўнальна кароткі тэрмін у Чырвонай Арміі выраслі высокамастацкія калектывы і паасобныя выканаўцы.

У часцях гарнізона налічваецца ўжо 5 ансамбляў чырвонаармейскай песні і пляскі, 4 аркестры народных інструментаў, дзесяткі хораў, ёсць добрыя партэрныя акрабатычныя групы, развіваецца эстраднае зацейніцтва.

Сотні чырвонаармейцаў, камандзіраў, членаў сямей начальніцкага саставу актыўна ўдзельнічаюць у стварэнні мастацкіх калектываў у Чырвонай Арміі.

Сярод байцоў гарнізона папулярнасцю карыстаецца ансамбль беларускай народнай песні і пляскі менскага Ваеннага вучылішча імя Леніна. У ансамблі прымаюць удзел 40 камандзіраў, курсантаў, жонак камандзіраў. У яго склад уваходзіць аркестр цымбалістаў. На выступленнях ансамбля асабліва запамінаецца выкананне ім «Лявоніхі». Да Кастрычніцкай галавіны ансамбль падрыхтуе рад новых песняў і ў прыватнасці песні з Пісьма беларускага народу вялікаму Сталіну.

Нязменны поспех мае аркестр з 75 гарманістаў-кавалерыстаў. У яго рэпертуары баяцца чырвонаармейскія песні, мелодыі і пляскі.

Любімыя песні ўсіх ансамбляў і хораў — песні аб Сталіне, аб Варашылаве, аб героіцы грамадзянскай вайны, аб шчаслівым радасным жыцці совецкага народу.

Пры Доме Чырвонай Арміі імя Варашылава ў Менску арганізаваўся эстрадна-самадзейны калектыў з спевакоў, чытцоў, танцораў, інструменталістаў. Створана група спевакоў, сярод якіх выдзяляюцца ваенны тэхнік Дзенісаў (бас), ваенны фельчар Сабальнікаў (барытон) і інш.

АД ОРПО ЦК КП(б)Б

У спісках выключаных з партыі, якія выклікаліся ў Менск на 4 жніўня, памылкова ўключан член партыі Шкалаў П. А., які з партыі не выключаўся.

Інструктар ОРПО ЦК КП(б)Б ХАДАКОВА.

АД РЭЧЫЦКАГА РК КП(б)Б

Згубленую кандыдацкую картку ўзору 1936 года за № 551090, выданую ПК КП(б)Б на імя Севасцьянава Шмена Янкава, лічыць несапраўднай.

Сакратар Рэчыцкага РК КП(б)Б РЫКАЎ.

ДЗЕННІК

— 2-я канферэнцыя комсамольскай арганізацыі Сталінскага раёна пераносіцца з 17 на 19 жніўня. Адкрыццё канферэнцыі адбудзецца 19 жніўня ў 7 гада. вечара ў памяшканні Дома партактыва (вялікая зала). Пасведчанні для дэлегатаў і пропускі на канферэнцыю выдаюцца з 2 гада. дня 16 жніўня да 5 гада. вечара 19 жніўня штодзённа ў памяшканні РК ЛКСМБ.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

СЕННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО:

Памяшканне Бел. дзярж. драм. тэатра т. 24-905 | Гастролі Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР

А. Карнейчук БАНКІР

П'еса ў 4 дзеях.

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка» КЛЯТВА

На летняй эстрадзе—канцэрт. аддз.

Дзіячы гукавы кінотэатр ДЭПУТАТ БАЛТЫКІ

Гукавы кінотэатр «Пролетарый» ГАЎРОШ

На летняй эстрадзе—канцэрт. аддз.

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал» СЫН РЫБАКА

Гукавы кінотэатр «Спартак» ДЗЯЎЧЫНА З ПАЛУБЫ (нямы варыянт)

ДЗЯРЖЦЫРК

Парк імя Горкага (тел. 22.725)

Гастролі дрэсіроўшчыка ІХАМЕЛІДЗЕ буйнейшага совецкага атракцыёна ЛЕО-МАРО

Апошнія гастролі ілюзіяністкі КЛЕО ДАРОШ

з яе 15 асістэнтамі-ліліпутамі

Таксама ўдзельнічае ўся група

Пачатак у 9 гадзін вечі.

Каса з 12—2 і з 5 гадз. веч.

БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ КОГИЗ'а

БАЦЬКІ і ВУЧНІ!

ХУТКА ПАЧЫНАЕЦЦА НОВЫ НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

КУПЛЯЙЦЕ загадзя СТАБІЛЬНЫЯ ПАДРУЧНІКІ

ПРОДАЖ на ўсіх кніжных магазінах КОГИЗ'а ў Менску і ў раёнах.

Там-жа можаце ПРАДАЦЬ па ўстаноўленай расцэнцы непатрэбныя вам скарыстаныя падручнікі.

ДА ЎВАГІ ДЫРЭКТАРОЎ І ЗАГАДЧЫКАЎ ШКОЛ і іншых навучальных устаноў

Ва ўзорна-паказальным універмагу „СОЮЗКУЛЬТТОРГА"

ёсць ВЯЛІКІ ВЫБАР ВУЧЭБНА-НАГЛЯДНЫХ ДАПАМОЖНІКАЎ

па фізіцы, матэматыцы, прыродазнаўству, геаграфічных карт і дыяпазітываў па ўсіх дысцыплінах.

ПРЭЙСКУРАНТЫ ВЫСЫЛАЮЦЦА ПА ПЕРШАМУ ПАТРАБАВАННЮ.

З ЗАКАЗАМІ ЗВАРАЧАЦЦА ПА АДРАСУ: МЕНСК, РОГ ВУЛ. КОМСАМОЛЬСКАЙ І КАРЛА МАРКСА, (ДОМ НАРКАМЛЕСА).

РАЗЛ. РАХУНАК 22061115 У БЕЛАРУСКАЙ КАНТОРЫ ДЗЯРЖБАНКА.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ПРАЦЯГНУТ ПРЫЁМ ЗАЯЎ да 20 ЖНІЎНЯ для паступлення на першы курс Беларускага сельскагаспадарчага інстытута сістэмы НКЗ СССР, на наступныя факультэты:

1. ЗААТЭХНІЧНЫ,
2. АГРАНАМІЧНЫ з аддзяленнямі: а) палаводчае, б) плодагароднае, в) селекцыі і насенаводства.
3. АГРАХІМІІ і ГЛЕБАЗНАЎСТВА,
4. ІНЖЫНЕРНА-ЗЕМЛЕЎПАРАДЧЫ.

Заявы з дакументамі падаваць на адрасу: г. Горы-Горкі, БССР. Сельскагаспадарчы інстытут.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ГОМЕЛЬСКІ НАСТАЎНІЦКІ ІНСТЫТУТ паведамляе, што НАБОР на ўсе аддзяленні настаўніцкага інстытута ПРАЦЯГНУТ да 20 ЖНІЎНЯ г. г.

Пры інстытуце ёсць аддзяленні: фізіка-матэматычнае, прыродазнаўча-геаграфічнае і літаратурнае.

Заявы накіроўваць па адрасу: г. Гомель, Пролетарская, 2.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ДА ЎВАГІ ПАКУПНІКОЎ! У МЭТАХ ЛЕПШАГА АБСЛУГОЎВАННЯ ПАКУПНІКОЎ МЕНСАЮЗУНІВЕРМАГ Совецкая, 59, тэл. 22-237 АДКРЫТ з 9 г. раніцы да 6 г. 30 м. вечара.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ПРЫЕМ ЗАЯЎ на гістарычны і геаграфічны факультэты МАГІЛЕЎСКАГА ПЕДІНСТЫТУТА і на аддзяленне літаратуры і мовы Магілеўскага настаўніцкага інстытута ПРАЦЯГНУТ да 20 ЖНІЎНЯ г. г.

ДЫРЭКЦЫЯ.

МЕНСКАЯ 2-гадовая ШКОЛА МЕДСЯСЦЁР абвяшчае НАБОР НА 1937—38 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

Школа медсясцёр рыхтуе медыцынскіх сясцёр па догляду за хворымі.

У школу прымаюцца грамадзяне абодвага полу ад 15 да 35 год, якія маюць агульнаадукацыйную падрыхтоўку не ніжэй 7 класаў сярэдняй школы.

Усе паступаючыя ў школу падвяргаюцца прыймовым іспытам па матэматыцы (арыфметыцы, алгебры, геаметрыі), фізіцы, геаграфіі, роднай мове і гісторыі.

УВАГА. Грамадзяне, якія маюць пасведчанне аб сканчэнні 7 класаў сярэдняй школы па асноўных прадметах на выдатна, а па маляванню, чарчэнню, спевах, музыцы, фізкультуры не ніжэй чым на добра, прымаюцца без іспытаў.

Прыём заяў аб залічэнні да 25 жніўня.

Іспыты з 15 па 25 жніўня.

Да заявы неабходна прыкласці: а) атэстат аб сканчэнні НСШ (у арыгінале), б) метрычны выпіс, в) даведку аб стане здароўя, г) 2 фотакарткі, д) аўтабіяграфію і е) на 40 кап. паштовых марак.

Слухачы забяспечваюцца стыпендыяй згодна існуючых правіл. Інтэрнатам школа не забяспечвае, але выплачвае кватэрныя.

Дакументы накіроўваць на адрасу: г. Менск, Клінічны гарадок, школа медсясцёр.

Канцылярыя адкрыта з 9 да 5 гадзін дня.

ДЫРЭКЦЫЯ ШКОЛЫ.

МЕНСКІ ВЯЧОРНІ ПЕДАГАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ ІМЯ А. М. ГОРКАГА

ПРАВОДЗІЦЬ ПРЫЕМ СТУДЭНТАЎ На 1937—38 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

На наступныя факультэты:

гістарычны, геаграфічны, літаратуры і мовы, дашкольны і на нямецкае аддзяленне факультэта замежных моў

Тэрмін навучання па факультэтах: гістарычным, геаграфічным, літаратуры і мовы — 2 гады, а на дашкольным факультэце і на нямецкім аддзяленні факультэта замежных моў — 4 гады.

Інстытут рыхтуе выкладчыкаў для сярэдняй школы, педагагічных вучылішч і рабфакаў.

У інстытут прымаюцца выключна настаўнікі поўнай і няпоўнай сярэдняй школы і работнікі дашкольных устаноў з закончанай сярэдняй адукацыяй (дзесяцігодка, педвучылішча, тэхнікум, рабфак) або атрымаўшыя атэстат аб сканчэнні сярэдняй школы ў парадку экстэрната.

Незалежна ад адукацыі паступаючыя падвяргаюцца іспытам у аб'ёме сярэдняй школы па рускай і беларускай мовах (пісьмовы твор, граматыка і літаратура), палітграмаце, матэматыцы (вусна і пісьмова), фізіцы, хіміі і па адной з замежных моў (англійскай, нямецкай, або французскай—па выбару паступаючага).

Паступаючыя на факультэты: гістарычны, геаграфічны, літаратуры і мовы падвяргаюцца дадатковым іспытам па геаграфіі.

УВАГА: Скончаўшыя сярэднюю школу (дзесяцігодку) і маючыя на асноўных прадметах адзнакі «выдатна», а па астатніх прадметах (маляванне, чарчэнне, спевы, музыка, фізкультура) адзнаку не ніжэй «добра», прымаюцца ў інстытут без прыймовых іспытаў. Гэта права распаўсюджваецца і на скончыўшых сярэднюю школу ў парадку экстэрната.

Заявы падаюцца на імя дырэктара МПІ з прадстаўленнем наступных дакументаў: аўтабіяграфіі, атэстата аб сканчэнні сярэдняй навучальнай установы (у арыгінале), пашпорта (прад'яўляецца пры асабістай яўцы), 3-х фотаграфічных картак (здымкі без галаўных убораў), з уласнаручным подпісам паступаючага на кожнай з іх, запераныя дзярж. установай, і даведкі аб адносінах да вайсковай павіннасці (для ваеннаабавязаных).

УВАГА: У заяве трэба ўказаць, які факультэт і спецыяльнасць паступаючы выбірае, а таксама падрабязны адрас.

ПРЫЕМ ЗАЯЎ АБ ЗАЛІЧЭННІ да 20 жніўня 1937 г., а прыймовыя іспыты і залічэнне ў лік студэнтаў да 25 жніўня 1937 г.

Заявы падаваць па адрасу: гор. Менск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, канцылярыя вячэрняга МПІ, пакой № 2-05 з 6 да 8 гадзін вечара.

МЕНСКІ ПЕДІНСТЫТУТ ІМЯ А. М. ГОРКАГА абвяшчае, што ПРЫЁМ ЗАЯЎ аб залічэнні на гістарычны і геаграфічны факультэты інстытута ПРАЦЯГНУТ да 20 ЖНІЎНЯ г. г.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ВІЦЕБСКІ ВЕТЭРЫНАРНА-ЗААТЭХНІЧНЫ ІНСТЫТУТ паведамляе, што ПРЫЕМ ЗАЯЎ ад уноўпаступаючых на абодвы факультэты ПРАЦЯГНУТ да 20 ЖНІЎНЯ г. г.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Уп. Галоўлітбела № К—3012. Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая, 63. Ю., М., Б.